Праграміст, зубны тэхнік, будаўнік былі ў гэтым годзе самымі папулярнымі спецыялістамі ў каледжах краіны. Прыём дакументаў у тых, хто паступаў у каледжы на аснове базавай школы, завяршыўся...

СТАР. 2

Плануеце прыбаўленне ў сям'і? На бусла і капусту па цяперашнім часе спадзявацца не варта. Варта – прыйсці на прыём да свайго ўчастковага тэрапеўта і гінеколага.

СТАР. 4

Калі перафразіраваць словы песні вядомага барда, водпуск — гэта маленькае жыццё. "Чаму не на моры?" А таму, што мне вельмі добра там, дзе я нарадзіўся.

СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЖНІЎНЯ 2013 г. СУБОТА № 143 (27508) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СЁЛЕТА КРАІНА АТРЫМАЕ БОЛЬШ ЗА 9 МЛН ТОН УРАДЖАЮ ЗБОЖЖАВЫХ І ПОЎНАСЦЮ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СЯБЕ ФУРАЖНЫМ ЗБОЖЖАМ

Аляксандр Лукашэнка ўчора зрабіў рабочую паездку ў Мінскую вобласць, перадае карэспандэнт БелТА.

У Мінскім раёне Прэзідэнт наведаў «Саўгас «Мінскі» ААТ «ДарАРС», дзе ў тым ліку азнаёміўся з арганізацыяй уборкі ячменю і тэхналагічнымі працэсамі нарыхтоўкі травяных кармоў. Кіраўніку дзяржавы паведамілі, што сёлета ў палімерныя матэрыялы запакавана сенажу амаль у два разы больш, чым летась, хоць гэта пакуль і значна менш чым запланавана. У будучым годзе такім чынам будзе нарыхтоўвацца каля трэці сенажу, для чаго гаспадаркі набываюць неабходную тэхніку. Прэзідэнта запэўнілі, што менавіта такая форма нарыхтоўкі кармоў спрыяе іх максімальнай захаванасці, што ў канчатковым выніку ўплывае на прадуктыўнасць у жывёлагадоўлі. «Тады трэба гэтым шляхам ісці: 30% у наступным годзе, палову ў 2015-м, а потым і цалкам, як гэта ўвесь свет робіць, заварочваць у рулоны», — зрабіў выснову беларускі лідар.

Як далажыў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц, ужо намалочана больш за 3 млн тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 33 ц/га. У папярэднія дні тэмпы ўборкі былі некалькі зніжаны з-за ўмоў надвор'я, аднак аграрыі разлічваюць завяршыць уборку збожжавых культур у аптымальныя тэрміны. Для гэтага, у тым ліку, ёсць неабходная тэхнічная магчымасць — значна абнавіўся парк камбайнаў, вырашаны пытанні па забеспячэнні палівам. «Ніякіх стрымліваючых фактараў няма. Самы галоўны фактар — умовы надвор'я», — канстатаваў міністр. «Што да валавога збору хлеба, то ў гэтым годзе адзначаецца зніжэнне па той прычыне, што вельмі сур'ёзны ўплыў аказала зіма. Гэта прывяло да недабору ўраджаю на азімых збожжавых культурах. Аднак ёсць вельмі нядрэнны яравы клін. За кошт таго, што ўраджай яравых збожжавых будзе некалькі вышэй мінулагодняга, мы забяспечым валавы намалот з улікам кукурузы не ніжэй за 9 млн тон», — сказаў Леанід Заяц.

Акрамя таго, сёлета краіне няма неабходнасці закупляць фуражнае збожжа, яго ў дастатковай колькасці нарыхтуюць айчынныя гаспадаркі. «Увесь свет лічыць збожжавыя, каласавыя і кукурузу разам. Мы павінны за 9 млн выйсці, як у мінулым годзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Тым часам, як было даложана Аляксандру Лукашэнку падчас яго рабочай паездкі, у краіне па выніках 2013 года чакаецца рост вытворчасці малака і мяса. Тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці ў мясной жывёлагадоўлі ў 2013 годзе можа скласці 106% да ўзроўню мінулага года. Аб'ёмы вытворчасці малака на гэты момант некалькі саступаюць леташнім, аднак аграрыі плануюць за кошт росту ў наступныя месяцы выйсці па году на ўзровень у 103%.

Кіраўніку дзяржавы таксама далажылі аб тым, як ідзе продаж мясной і малочнай прадукцыі. «На рынку сітуацыя па малаку выдатная. Ідзе ў плюс і аб'ём рэалізацыі, і цана ўзрастае, і рэнтабельнасць», — адзначыў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання. Што тычыцца мясной прадукцыі, яна таксама прадаецца, і на яе ёсць попыт, аднак маюцца пэўныя цяжкасці ў рэалізацыі гатовых вырабаў. Разам з тым чакаецца, што гэтая сітуацыя павінна ў хуткім часе выраўняцца.

Прэзідэнт таксама нагадаў, што даручаў сёлета ўшчыльную заняцца і льнаводчай сферай. «Я хачу пры жорсткім кантролі за вырошчваннем лёну паглядзець, можам мы з ільном працаваць і вынік даваць ці не. Жалезна — на кантроль і даклад мне, што атрымаем па восені», — даручыў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што паралельна ў Беларусі вядзецца мадэрнізацыя льнозаводаў, гэтая работа павінна быць завершана ў 2015 годзе. Дарэчы, сёлета лён вырас на парадак лепшы, чым у 2012-м, ёсць у наяўнасці неабходныя механізмы і тэхніка для яго ўборкі і апрацоўкі.

Кіраўнік дзяржавы асабліва звярнуў увагу на неабходнасць строгага выканання графіка ўзаемаразлікаў паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі, што занятыя ў ільняной галіне. «Глядзіце, каб мы тут не атрымалі зноў, што льнокамбінат не разлічыцца з ільнозаводамі за валакно, а льнозаводы — з калгасамі і саўгасамі. Гэтага быць не павінна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Першы «двухтысячнік» на Магілёўшчыне

Экіпаж камбайнера Уладзіміра Мельнікава і яго сына Дзмітрыя з агракамбіната «Зара» Магілёўскага раёна першымі ў рэгіёне намалацілі больш за 2 тысячы тон збожжа новага ўраджаю.

Проста на полі перадавікоў павіншаваў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік. Бацьку і сыну ўручылі кветкі і падарункі. Уладзімір Мельнікаў адпрацаваў у сельскай гаспадарцы 35 гадоў і ўжо неаднойчы прымаў віншаванні за 2-е і 3-е месцы на рэспубліканскім фестывалі-кірмашы «Дажынкі». Цяпер сямейны экіпаж Мельнікавых імкнецца да новых высокіх вынікаў. Рубеж намалоту ў 1 тысячу тон у Магілёўскай вобласці перасягнулі 20 экіпажаў камбайнераў і 87 вадзіцеляў. Прычым сем вадзіцеляў перавезлі ўжо больш за 2 тысячы тон збожжа. Паводле інфармацыі на 1 жніўня, у Магілёўскай вобласці намалацілі больш за паўмільёна тон збожжа, убралі больш за 40% пасяўных плошчаў. Сярэдняя ўраджайнасць перавышае 37 цэнтнераў з гектара.

Ілона ІВАНОВА.

■ Кропка на планеце: N54°01.122' E31°53.381'

ЖАНВІЛЬСКІЯ БЕЛАРУСЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

і іншыя насельнікі вёскі на беларуска-расійскім памежжы

Жанвіль. Вёска, назва якой гучыць на французскі манер, нейкім дзіўным чынам узнікла там, дзе рака Сож размяжоўвае дзве краіны — Беларусь і Расію, на самым-самым памежжы Магілёўскай і Смаленскай абласцей. Калі больш дакладна — там, дзе шчыльна, па-сваяцку прыхінуліся адзін да аднаго Мсціслаўскі і Хіславіцкі раёны. У часы, калі жылі без межаў (у тым ліку і ў СССР), Жанвіль быў звычайнай вёскай у атачэнні іншых. І бліжэйшая да яе беларуская вёска Парадзіна, была ці не асноўным «пастаўшчыком» жаніхоў і працоўнай сілы. Цяпер беларусаў на расійскім баку Сожа не так шмат, як раней, бо многія з іх атрымалі расійскае грамадзянства і лічаць сябе рускімі. Але ўсё роўна без беларусаў уявіць сучаснае жыццё Жанвіля немагчыма. Тыя, што прыйшлі сюды ў прымакі, працуюць механізатарамі і жывёлаводамі. Многія з іх ужо на пенсіі, а некаторыя толькі пачынаюць ставіць на ногі сваіх нашчадкаў, працягваючы жанвільскі беларускі радавод.

Адзін з апошніх беларусаў, які стаў жыхаром гэтай вёскі — жывёлавод мясцовага СВК «Звязда» Васіль Андрэеў (на фотаздымку). Не, ён паходзіць не з суседняй вёскі Парадзіна альбо Засожжа, а з больш далёкага Чэрыкаўскага раёна. З будучай жонкай — жыхаркай Жанвіля — пазнаёміўся яшчэ падчас вучобы ў Мсціслаўскім ліцэі. Пасля вяселля сям'я Васіля засталася на расійскім баку, і цяпер яго першая дачка Соф'я лічыцца самай маленькай жанвільскай беларускай.

СТАР. 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінгарвыканкама:

«Насельніцтва неабходна больш актыўна прыцягваць да добраўпарадкавання дваровых тэрыторый. Пра гэта гаворыцца ўжо не першы год. Тым не менш кіраўніцтва сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі недапрацоўвае ў гэтым кірунку. Супрацоўнікі адміністрацый раёнаў, адказныя за ідэалагічную работу з насельніцтвам, дырэктары ЖЭС, старшыні таварыстваў уласнікаў цалкам здольныя пераканаць жыхароў навесці парадак у сваіх дварах. І пажадана пры гэтым звяртаць увагу на знешні выгляд дома, захаванне чысціні ў пад'ездах. Трэба прывесці ў парадак кожны двор, кожны пад'езд».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.08.2013 г.

Долар ЗША		8890,00 ■
Еўра		11750,00 ▼
Рас. руб.		268,50 ▼
Укр. грыўня		1092,14 ▼

НАДВОР'Е СЕННЯ

Брэст	+ 27°
Віцебск	+ 23°
Гомель	+ 23°
Гродна	+ 27°
Магілёў	+ 23°
Мінск	+ 25°

■ Арэнда жылля

АГЕНЦТВАМ НЕРУХОМАСЦІ ЗАБАРОНЯЦЬ ПРАДАВАЦЬ «КАТОЎ У МЯШКУ»

Сёлета юрыстамі быў падрыхтаваны праект пастановы Савета Міністраў Беларусі аб адмене інфармацыйных паслуг, што аказваюцца рыэлтарскімі арганізацыямі, паведаміла начальнік упраўлення адвакатуры і ліцэнзавання юрыдычнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі Галіна ГРЫШКАВЕЦ. Гэты дакумент можа быць прыняты ўжо да канца 2013 года.

Нагадаю, што ў Мінюсце ўжо другі год дзейнічае працоўная група па ўдасканаленні той часткі заканадаўства, якая рэгулюе рыэлтарскую дзейнасць. Цяпер на стадыі ўзгаднення знаходзіцца праект пастановы Савета Міністраў, які прадугледжвае выключэнне інфармацыйных паслуг агенцтваў у «чыстым выглядзе». У ім будзе замацаваны абавязак рыэлтарскай арганізацыі аказваць паслугі па арэндзе жылля толькі пры ўмове аплаты па факце засялення. Праект, верагодна, будзе падпісаны да канца бягучага года, удакладняе Галіна Грышкавец. Акрамя скасавання інфармацыйнай паслугі аб нерухомасці, мяркуюцца тарыфныя змены па рыэлтарскіх паслугах, але толькі для юрыдычных асоб.

СТАР. 2

«РАСПЛЯСКАЛАСЯ СІНЬ, РАСПЛЯСКАЛАСЯ. ПА ЦЯЛЬНЯШКАХ РАЗЛІЛАСЯ, ПА БЕРЭТАХ...»

Словы гэтай песні знаёмыя ўсім тым, хто 2 жніўня адзначае сваё галоўнае свята — Дзень паветрана-дэсантных войскаў. Дэвіз дэсантнікаў «Ніхто, акрамя нас!» стаў галоўным і ў штодзённым жыцці.

У дзень свята сотні дэсантнікаў сустрэліся каля вострава Мужнасці і Смутку, каб ушанаваць памяць загінулых, сустрэцца з саслужыўцамі. У Мінск прыехалі «блакітныя берэты» не толькі з Беларусі, а нават з суседніх краін — былі тут і расіяне, і ўкраінцы, але ўсіх іх аб'ядноўвае «крылатая пяхота».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ГЕРМАНІІ ХОЧУЦЬ ВЫСЯЛЯЦЬ КВАТЭРАНАЙМАЛЬНІКАЎ, ЯКІЯ КУРАЦЬ

Суд нямецкага горада Дзюсельдорф задаволіў іск уладальніцы арэнднага дома, якая вырашыла выселіць з кватэры пенсіянера, які курыць. Як адзначыла гаспадыня, суседзі 74-гадовага Фрыдхельма Адольфа пастаянна скардзіліся на тое, што дым з яго кватэры пранікае ў месцы агульнага карыстання. Мужчына, які пражыў у доме 40 гадоў, на судзе спрабаваў даказаць, што пах распаўсюджваецца з-за дрэннай ізаляцыі. Суд пастанавіў: калі курэц прычыняе нязручнасці арэндадаўцу або жыхарам, то ён можа быць выселены са здымнай кватэры. Пры гэтым, як падкрэсліў суд, грамадзяне маюць поўнае права курыць у сваіх уласных дамах.

«ПОШТУ РАСІІ» АШТРАФУЮЦЬ

Найбуйнейшы філіял «Пошты Расіі», што на праспекце Вярнадскага ў Маскве, аштрафавалі на 120 тысяч расійскіх рублёў. Суд прыняў адпаведнае рашэнне з прычыны шматлікіх парушэнняў і гублянняў пасылак. Раней паведамлялася, што «Пошту Расіі» аштрафавалі больш чым на 350 тысяч рублёў за парушэнне тэрмінаў перасылкі паштовых адпраўленняў. Паводле звестак ведамства, на тэрыторыі аэрапорта «Дамадзедава» былі пакінуты неапрацаваныя міжнародныя адпраўленні агульнай вагой больш за 91 тону, у аддзяленні «Унукава» — больш за 38 тон, у «Шарамецьева» — 61 тона, на грузавых тэрміналах аэрапорта «Шарамецьева» — 128 тон. У лютым 2013 года на тэрыторыі маскоўскага авіяцыйнага вузла ўтварыўся «паштовы калапс» з пасылак з-за мяжы, якія сабраліся ў сталічных аэрапортах.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ШАКАЛАД СПРЫЯЕ КУПЛІ РАМАНТЫЧНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Пах шакаладу аказаўся стымулятарам пакупак любоўных раманаў і кулінарных кніг — іх пачынаюць браць з прылаўкаў амаль у 4 разы часцей, чым звычайна. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы з Антверпена, горада, у якім вырабляецца славуты бельгійскі шакалад. Высновы спецыялістаў прыводзіць The Guardian.

Згодна з вынікамі дзесяцідзённага даследавання з удзелам 201 чалавека, калі ў гандлёвай зале пахне шакаладам, наведнікі праяўляюць актыўнасць і гатоўнасць купіць кнігу ў 5,93 раза больш, чым пры звычайных умовах. Акрамя таго, антверпенскія навукоўцы высветлілі, што калі ў кнігарні пахне шакаладам, то людзі, па-першае, захочуць зайсці і проста пабадзяцца паміж прылаўкамі, а па-другое, хутчэй набудуць кнігу пэўнай накіраванасці, чым не купяць нічога. На іх думку, пах шакаладу выклікае пэўныя асацыяцыі, і менавіта таму людзі выбіраюць раманты ку і кулінарыю.

Аднак на людзей, якія прыйшлі ў краму з выразнай мэтай абзавесціся той ці іншай кнігай, пах шакаладу дзейнічае адмоўна, і яны губляюцца. Таксама шакалад практычна не аказвае ўплыву на продаж коміксаў, графічных раманаў, кніг па садоўніцтве, эканоміцы, менеджменце і праве — прыемны пах павышае цікавасць да гэтых выданняў толькі ў 1,2 раза.

КАРОТКА

Беларусь часова абмежавала ўвоз свойскіх і дзікіх жвачных жывёл з Літвы. Паводле інфармацыі, якая ёсць у дэпартаменце, на тэрыторыі Літвы выяўлены жывёлы, серапазітыўныя па хваробе Шмаленберга.

Учора ў Жлобіне малады мужчына скочыў з моста на чыгунку ў момант, калі ўнізе праходзіў хуткі цягнік «Мінск — Сімферопаль». Ён апынуўся ў міжрэйкавай прасторы, таму, атрымаўшы шматлікія траўмы і пашкоджанні, застаўся жывы і быў дастаўлены ў рэанімацыю. Рух не быў спынены.

Паблізу вёскі Зубакі Віцебскага раёна ў лесе быў знойдзены сапраўдны арсенал боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Сапёры знішчылі больш за 90 артылерыйскіх снарадаў, 4 гранаты і 2 мінамётныя міны.

Спецыялістамі санітарна-эпідэміялагічнай службы з 26 чэрвеня па 1 жніўня праведзена абследаванне 409 зон масавага адпачынку каля вады, на 34 з іх выяўлены парушэнні санітарных нормаў, правілаў і гігіенічных нарматываў. Іх праца абмежавана, прыпынена або забаронена.

ДЗЕ ВЫ ЗБІРАЕЦЕСЯ ПРАВЕСЦІ АДПАЧЫНАК?

Кацярына ЧАХОВІЧ, індывідуальны прадпрымальнік, г. Мінск:

— Свой водпуск, які будзе ў верасні, я збіраюся правесці ў туры па Еўропе з шасцідзённым знаходжаннем на ўзбярэжжы Адрыятычнага мора ў Італіі. Вельмі ўпадабалі гэтую краіну раз і назаўжды, таму нават не хочацца траціць каштоўны час адпачынку на любыя іншыя курорты. Прыязнасць нацыі, велічнасць палацаў і будынкаў, рамантычнасць, прыгажосць захаду сонца на Міжземным моры, паветра, сэрвіс і яшчэ шмат розных прычын не пакідаюць іншага выбару, акрамя як зноўку прыязджаць туды. Хочацца яшчэ раз пракаціцца на гандоле па шматлікіх каналах Венецыі, узяўшыся за руку з каханым чалавекам, і акунуцца ў незабыўную атмасферу гэтай чароўнай краіны.

Лізавета ТРУШЧАНКА, карэспандэнт газеты «Мы і час» Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, выкладчык гісторыі Беларусі, г. Віцебск:

— Пакуль дакладна не ведаю, дзе буду адпачываць. Марыла пра экскурсійную паездку на тыдзень у Чэхію і Германію. Калі мара не здзейсніцца, буду адпачываць у Беларусі: з'езджу да сяброў у Мінск, магчыма, куды-небудзь на возера на пару дзён, абавязкова ў вёску да бабулі — там чыстае паветра, пах сена, а галоўнае — цішыня. Гэта тое месца, дзе сапраўды адпачываеш ад гарадскога рытму. Я лічу, што праводзіць водпуск добра і за мяжой, і ў нас. Таму, напэўна, ідэальны адпачынак для мяне — гэта спалучэнне экскурсій па новых мясцінах і вясковай цішыні хаця б на тыдзень.

Уладзімір МІКУЛЬСКІ, студэнт Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва, г. Мінск:

— На жаль, сёлета мне адпачываць не давядзецца, таму пахваліцца ў гэтым плане няма чым. Летам я заканчваю інстытут. Таму пакуль што ў прырыртэце — пошук працы, на яго і накіруе ўсе намаганні, бо цяпер пастаяннага месца я пакуль што не маю, і ўвесь час даводзіцца падпрацоўваць. Адзінае што, магчыма, атрымаецца, — з'ездзіць на некалькі дзён на Нарач. Шашлыкі, рыбалка, добрая кампанія... Не замежжа, вядома ж, але ўражанняў шмат. А па-сапраўднаму адпачываць ужо буду зімой.

Падрыхтавала Дзіяна СЕРАДЗЮК.

...ЗАБАРОНЯЦЬ ПРАДАВАЦЬ «КАТОЎ У МЯШКУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле інфармацыі Галіны Грышкавец, унясенне змяненняў у заканадаўства абумоўлена частымі скаргамі на нездавальняючую якасць інфармацыйных паслуг у агенцтвах нерухомасці, якія тычацца падбору варыянтаў да заключэння дагавораў арэнды жылля.

Прадстаўнік Мінюста падкрэсліла, што выключэнне інфармпаслуг — гэта не толькі рэкамендацыя міністэрства, але і рады рыэлтараў пры Мінюсце. Кіраўнікі вядучых рыэлтарскіх арганізацый лічаць неабходным унясенне змяненняў у заканадаўства з мэтай замацавання абавязку рыэлтарскай арганізацыі аказваць паслугі па арэндзе жылля толькі пры ўмове аплаты па факце засялення.

Галіна Грышкавец лічыць унясенне аплаты па факце засялення справядлівай формай узаемаадносін кліента і агенцтва нерухомасці. Зараз на рынку арэнды прыватнага жылля існуе два віды паслуг, што аказваюцца агентамі па арэндзе нерухомасці. Першая з іх вядомая як інфармацыйная, калі кліенту прапануюцца нейкія звесткі (звычайна гэта тэлефон гаспадара і вуліца мікрараёна) аб здымных кватэрах. Другая паслуга ўяўляе сабой падбор варыянтаў здзелкі, дзе спецыяліст агенцтва «апякуе» кліента да таго часу, пакуль ён не атрымае ключы ад кватэры. Больш распаўсюджаная назва гэтай паслугі — «па факце засялення».

Праблема прадастаўлення не зусім якасных паслуг па арэндзе жылля асобнымі агенцтвамі нерухомасці зараз і сапраўды існуе, адзначыў рэдакцыі **старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», дырэктар агенцтва нерухомасці «БелЦТН» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.**

Паводле яго звестак, у Мінску такіх агенцтваў, што прапануюць кліентам толькі інфармацыю аб здымным жыллі, не больш за 10. Галоўным чынам падобныя структуры і займаюцца толькі арэндай кватэр. Тыя сур'ёзныя агенцтвы, якія займаюцца купляй і продажам, даволі трапятліва ставяцца да свайго іміджу, таму прапануюць кліентам паслугу па арэндзе жылля толькі ў варыянце «па факце засялення». «Адразу заўважу, што ў Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» такіх, накіраваных выключна на арэнду кватэр, агенцтваў нерухомасці няма. Таму наша грамадская арганізацыя амаль не можа паўплываць на дзейнасць падобных прадпрымальніцкіх структур. Кантраляваць дзейнасць усіх агенцтваў нерухомасці Беларусі было б магчыма ў тым выпадку, калі б наша арганізацыя атрымала статус самарэгулюючай», — патлумачыў сітуацыю Мікалай Праставалупаў.

Нагадаю, што летась у жніўні Мінюст ужо пазбаўляў ліцэнзій за падобныя парушэнні адразу тры «арэндныя» сталічныя агенцтвы.

Мікалай Праставалупаў упэўнены, што навядзенне парадку ў сферы арэнды не зменіць памеры цэннікаў здымных кватэр у сталіцы, якія зараз і так застаюцца на даволі высокім узроўні.

Сяргей КУРКАЧ.

ТЕХНОБАНК

ПРЕДЛОЖЕНИЕ (ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА) ДЕРЖАТЕЛЯМ БАНКОВСКИХ ПЛАТЕЖНЫХ КАРТОЧЕК ОАО «ТЕХНОБАНК» О ЗАКЛЮЧЕНИИ ДОПОЛНИТЕЛЬНОГО СОГЛАШЕНИЯ К ДОГОВОРУ КАРТ-СЧЕТА

Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 416-З внесены изменения и дополнения в Банковский кодекс Республики Беларусь в части совершения операций с банковскими платежными карточками, в частности, термин «банковская пластиковая карточка» изменен на «банковская платежная карточка», исключено понятие «карт-счет». Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 18.01.2013 № 34 утверждена Инструкция о порядке совершения операций с банковскими платежными карточками.

В связи с указанными изменениями в законодательстве, **ОАО «Технобанк» (далее – Банк) предлагает физическим лицам, у которых с ОАО «Технобанк» заключены договоры карт-счета (далее – Клиенты), заключить дополнительные соглашения к действующим договорам с целью приведения их в соответствие с законодательством Республики Беларусь без необходимости посещения Клиентами офисов Банка, на следующих условиях:**

в наименовании и по тексту договора слова «карт-счет» заменить словами «текущий (расчетный) счет с использованием банковской платежной карточки», в соответствующих падеже и числе;

слова «банковская пластиковая карточка» по тексту договора заменить словами «банковская платежная карточка» в соответствующих падеже и числе.

Для заключения дополнительного соглашения к договору карт-счета Банк размещает настоящую публичную оферту в сети Интернет на сайте Банка по адресу: www.tb.by, на информационных стендах Банка и в газете «Звязда», а Клиентам для ее акцепта (согласия) предлагается совершить любую расходную операцию с использованием банковской платежной карточки (далее – карточка) или ее реквизитов (снятие наличных денежных средств, проведение оплаты товаров, работ и (или) услуг и др.).

Дополнительное соглашение к договору карт-счета, заключенному между Банком и Клиентом, считается заключенным с момента акцепта Клиентом настоящего предложения при условии соблюдения следующих условий:

- договор карт-счета на момент акцепта является действующим;

- акцепт Клиентом настоящего предложения должен быть осуществлен в период с 01 августа 2013 г. по 15 декабря 2013 г. (включительно) путем совершения любой расходной операции с использованием банковской платежной карточки, выданной в соответствии с договором карт-счета, или ее реквизитов (снятие наличных денежных средств, проведение оплаты товаров, работ и (или) услуг и др.).

Заключение дополнительного соглашения не затрагивает установленный порядок проведения операций с карточкой и не влечет замену карточки.

Настоящее предложение (публичная оферта) может быть отозвана Банком путем опубликования извещения об отзыве в сети Интернет на веб-сайте Банка по адресу: www.tb.by, на информационных стендах Банка и в газете «Звязда».

Клиенты, не осуществившие расходные операции в указанный для акцепта срок, должны обратиться в подразделение Банка, в котором был заключен договор карт-счета, не позднее 15 декабря 2013 года, для заключения в письменной форме соглашения к действующим договорам карт-счета, с целью приведения их в соответствие с законодательством Республики Беларусь.

ВНИМАНИЮ КЛИЕНТОВ: счета Клиентов, не осуществивших расходные операции в указанный для акцепта срок и не обратившихся в подразделение Банка для заключения дополнительного соглашения к договорам карт-счета до 15 декабря 2013 г., будут закрыты Банком во исполнение требования пп.2.6. Постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 18.01.2013 № 34 в срок до 31 декабря 2013 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 05.06.2013 г. выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100706562.

УНП 290984478

Да ўвагі акцыянераў

Адкрытага акцыянернага таварыства «Сталічны праспект»!

13 жніўня 2013 года

АДБУДЗЕЦЦА ПАЗАЧАРГОВЫ АГУЛЬНЫ СХОД АКЦЫЯНЕРАЎ ААТ «Сталічны праспект» (г. Жабінка, вул. Цітова, 3).

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб выплаце дывідэндаў за першае паўгоддзе 2013 года.

Форма правядзення Сходу – **вочная.**

Месца правядзення Сходу – **г. Жабінка, пасёлак Цукровага завода, клуб ААТ «Жабінкаўскі цукровы завод».**

Пачатак работы сходу: **13 жніўня 2013 года ў 12 гадзін 30 хвілін.**

Рэгістрацыя асоб, якія маюць права на ўдзел у Сходзе, ажыццяўляецца ў дзень правядзення Сходу па месцы правядзення Сходу на падставе дакументаў, якія пацвярджаюць асобу, і належна аформленых даверанасцяў. Час пачатку рэгістрацыі: **11 гадзін 30 хвілін. Час завяршэння рэгістрацыі: 12 гадзін.**

З матэрыяламі Сходу можна азнаёміцца **з 05 жніўня 2013 года па 12 жніўня 2013 года ў працоўныя дні з 10 да 17 гадзін.**

■ Прыёмная кампанія — 2013

КАЛЕДЖЫ І ПРАФТЭХУСТАНОВЫ — У ЧАКАННІ АБІТУРЫЕНТАЎ

У вышэйшых навучальных установах краіны прыёмная кампанія набліжаецца да свайго лагічнага завяршэння — прыём дакументаў на платную форму навучання спыніцца 4 жніўня. А ў каледжах прыём дакументаў ад выпускнікоў сярэдніх школ будзе доўжыцца на бюджэтную форму навучання да 8 жніўня, а на платную — да 14 жніўня.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

25 ліпеня ў каледжах завяршылася залічэнне на скарочаную бюджэтную форму навучання на аснове прафесійна-тэхнічнай адукацыі. План прыёму па краіне складаў 4 440 чалавек. Залічана было 4 257 чалавек, або 96% ад плана.

29 ліпеня спынены прыём дакументаў у абітурыентаў, якія паступаюць у каледж пасля заканчэння базавай школы. Уступныя іспыты для іх будуць доўжыцца да 8 жніўня. Калі меркаваць па колькасці пададзеных заяў, то найбольш запатрабаванымі ў дзевяцікласнікаў сталі сёлета прафесіі праграміста, юрыста, памочніка ўрача па амбулаторна-клінічнай дапамозе, зубнога тэхніка, тэхніка-будаўніка, мастака-мадэльера (цырульніка), дызайнера, тэхніка-механіка па эксплуатацыі аўтамабіляў, тэхніка-электрыка і тэхніка-энергетыка. Вялікую цікавасць у абітурыентаў выклікае таксама сфера сувязі і камунікацый, аўтаматызацыя вытворчых працэсаў, дрэваапрацоўка, сфера турызму і сацыякультурная дзейнасць (замежныя мовы і справаводства). У Міністэрстве адукацыі з задавальненнем адзначаюць, што зацікаўленасць моладзі ў эканамічных спецыяльнасцях пачала зніжацца, што адпавядае адсутнасці попыту на гэтых спецыялістаў на рынку працы. Затое на рынку працы ёсць востры попыт на спецыялістаў у машынабудаўнічай галіне, сельскай гаспадарцы, хімічнай прамысловасці, народнай творчасці, аднак абітурыентаў гэтыя спецыяльнасці мала цікавяць.

«У каледжах прыём дакументаў ад выпускнікоў сярэдніх школ будзе доўжыцца на бюджэтную форму навучання — да 8 жніўня, а на платную — да 14 жніўня. Прыём дакументаў для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі на дзённай форме навучання будзе весціся да 20 жніўня».

У Міністэрстве адукацыі нагадваюць, што з 1 верасня 2013 года ў каледжах распачнецца падрыхтоўка спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй па чатырох новых спецыяльнасцях і адной новай спецыялізацыі. Так, па заяўцы Парка высокіх тэхналогій адкрываецца новая спецыяльнасць «Тэсціраванне праграмнага забеспячэння». Па заяўцы Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў адкрываецца спецыяльнасць «Паляўнічая гаспадарка».

Моладзь павінны зацікавіць і такія перспектыўныя спецыяльнасці, як «Абсталяванне мэблевай вытворчасці», «Мехатроніка» з прысваеннем кваліфікацыі рабочага з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй «Мехатронік 5 разраду». Выпускнікі гэтай спецыяльнасці будуць працаваць на прадпрыемствах па вытворчасці харчовых прадуктаў. Не менш цікавая і новая спецыялізацыя «Радыёсістэмы аховы і тэленазіранне».

Варта нагадаць, што пры паступленні ў каледжы выпускнікі сярэдніх школ маюць магчымасць падаваць сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання нават з мінімальнай колькасцю балаў — ад 1 бала і больш, што немагчыма было пры паступленні ў ВНУ.

Працягваецца таксама прыём дакументаў і ва ўстановах, якія рэалізуюць праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Па стане на 26 ліпеня ў прафтэхустановы падалі свае дакументы 20,8 тысячы чалавек, што складае 61,5% ад кантрольных лічбаў набору. Прыём дакументаў для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі на дзённай форме навучання будзе весціся да 20 жніўня. А пры неабходнасці можа быць падоўжаны...

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Акцэнты тыдня з Вадзімам Гігіным

РЭЛІГІЯ — ГЭТА ЯШЧЭ ТРОХІ І ПАЛІТЫКА

У нас. Звычайна апошнія тыдні лета — так званая «мёртвая пара» ў палітыцы. Безумоўна, нельга сказаць, што зусім нічога не адбываецца, аднак асноўныя палітычныя дзеячы нібыта збіраюць сілы, каб пачаць новы сезон.

Таму, безумоўна, галоўнай навіной мінулага тыдня сталі мерапрыемствы, якія, на першы погляд, не маюць непасрэднага дачынення да палітыкі — святкаванне 1025-годдзя Хрышчэння Русі.

Калі абстрагавацца ад рэлігійнай і духоўнай сутнасці свята (што зрабіць даволі цяжка), то можна прыйсці да цікавых высноў. У гэтыя дні святкавалася не толькі гадавіна прыняцця ўсходнімі славянамі хрысціянства ў 988 годзе, але і 25-гадовы юбілей аднаўлення паўнавартаснай дзейнасці праваслаўнай Царквы на нашых землях. Трэба сказаць, што за гэты час яе ўплыў стаў адчувальным і значным не толькі ў духоўным і культурным, але і ў грамадска-палітычным жыцці.

Добра гэта ці не, аднак Царква зараз з'яўляецца суб'ектам палітыкі. Як інстытут яна мае разгалінаваную структуру, усё больш людзей прыслухоўваюцца да голасу сваіх святароў. Актыўнасць царквы ў сродках масавай інфармацыі ўзрастае. Паказальна, што ўсе тры кіраўнікі дзяржаў, якія лічаць сябе нашчадкамі Кіеўскай Русі, — Аляксандр Лукашэнка, Уладзімір Пуцін і Віктар Януковіч — у сваіх выступленнях падчас святкавання падкрэслівалі асаблівую значнасць ролі Царквы ў сучасным грамадстве.

З пункту гледжання міжнароднай палітыкі Руская Праваслаўная Царква выступае адным з галоўных фактараў развіцця інтэграцыі на постсавецкай прасторы, асабліва паміж усходнеславянскімі дзяржавамі. Нягледзячы на распад адзінай краіны, РПЦ захавала сваё адзінства. Нават царкоўны раскол ва Украіне не надта пахіснуў пазіцыі Маскоўскага патрыярхату.

Можна сказаць, што сама ідэя еўразійскай інтэграцыі для праваслаўных з'яўляецца цалкам натуральнай, бо праваслаўе ўзнікла ў Візантыі, якая і геаграфічна, і цывілізацыйна знаходзілася адразу і ў Еўропе, і ў Азіі.

Таму на бліжэйшыя гады, нават дзесяцігоддзі можна прагназаваць толькі рост царкоўнага ўплыву на ўсе бакі жыцця грамадства. І мінулы юбілей гэта яскрава пацвердзіў.

Вакол нас. Кожны палітык штодня займаецца неверагоднай колькасцю разнастайных спраў. Але ў гісторыі застаецца дзякуючы нейкаму аднаму стэрэатыпу, часта не вельмі істотнаму, але даволі рэзанансному. Сільвія Берлусконі, верагодна, запомніцца, сваімі шматлікімі судовымі працэсамі.

Нарэшце 4 жніўня суд вышэйшай інстанцыі пацвердзіў прыгавор, паводле якога 76-гадовы італьянскі палітык і бізнесмен павінен быў бы правесці 4 гады ў турме і назаўжды пазбавіцца права займаць дзяржаўныя пасады. Праўда, у адпаведнасці з італьянскімі законамі, асобы такога ўзросту не могуць быць зняволены. Ды і забарона займаць кіруючыя пасады таксама яшчэ будзе абскарджана ў судзе.

Але справа не ў гэтым, а ў самім рэкордным пераследзе Сільвіа Берлусконі з боку судовых улад.

Вядома, нельга сцвярджаць, што былы італьянскі прэм'ер крышталь чысты і ніколі не здзяйсняў злачынстваў. Аднак тая колькасць абвінавачванняў, якую яму прад'яўлялі, выклікае пытанні. Махлярства і подкуп, злоўжыванне службовым становішчам і сексуальная эксплуатацыя непаўналетніх. Усяго некалькі дзясяткаў спраў, якія заводзіліся ў розныя гады. Пагадзіцеся, цяжка паверыць, што гэта не арганізаваная кампанія! Часам складвалася ўражанне, што палітычныя ворагі энергічнага Берлусконі быццам перабіраюць увесь крымінальны кодэкс у спробе знайсці хоць нешта, што б дапамагло ім выбіць моцнага саперніка з гульні.

Хто ж гэтыя ворагі? Яны вельмі ўплывовыя. У стане праціўнікаў Берлусконі італьянскія левыя і магутная брусельская бюракратыя з кіраўніцтва ЕС, бізнес-канкурэнты і нават анархісты.

Берлусконі — моцны палітык харызматычнага складу. Чалавек, які зрабіў сябе сам. Такі тып зараз не ў модзе ва ўладных калідорах краін ЕС. Там больш прызвычаіліся да розных шэрых мышэй і нават пацучкоў, якіх разводзяць у шматлікіх «палітычных школах», створаных пад эгідай Бруселя і Вашынгтона. Цікава, што адна з самых уплывовых паліталагічных арганізацый Італіі так і называецца — «Амерыканскі ўніверсітэт у Рыме».

Сільвіа Берлусконі — прадстаўнік выміраючага віду яркіх і моцных палітыкаў, якія маглі адстойваць інтарэсы сваёй краіны. Так, у іх шмат недахопаў, але галоўная іх асаблівасць, якая і прываблівае народ, — воля і ўпэўненасць ва ўласных сілах. Якасці, якія, верагодна, не запатрабаваны зараз у ЕС.

З гісторыі. Цікава, што на дзень 29 ліпеня прыпадае адразу дзве падзеі — па-свойму знакавыя для беларускага грамадства. У 1939 годзе Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне пра перайменаванне Менска ў Мінск, а ў той жа дзень у 1961 годзе гарадскі пасёлак Шацілкі стаў горадам з іншай назвай — Светлагорск.

Можна сказаць: «Ну і што?». Але тут важная сама тэндэнцыя. XX стагоддзе — гэта час ператварэння беларусаў — першапачаткова нацыі сялянскай, вясковай — у гарадскую. Таму і ўсё, што звязана з гарадскім жыццём — ці то назва самога паселішча, ці то яго ўпарадкаванне — паступова набывае іншы сэнс.

Урбанізацыя беларусаў (менавіта народа, а не толькі эканомікі альбо інфраструктуры) праяўляецца літаральна ва ўсім. Дастаткова паглядзець на літаратуру. Купала, Колас, Багдановіч, нават Чорны і Гарэцкі, нягледзячы на свой статус гарадскіх жыхароў, тыповыя сялянскія паэты і пісьменнікі. Для іх уласны народ найперш вясковы. Але ўжо ў другой палове XX стагоддзя ўсё змяняецца. Ужо ў Мележа, Шамякіна мы бачым сутыкненне горада і вёскі, іх узаемасувязь. А ўся сучасная беларуская літаратура амаль цалкам гарадская. Нават калі наш сучаснік піша пра вёску, то глядзіць на яе ўжо вачамі гараджаніна. І гэта тычыцца не толькі літаратуры, нават не толькі мастацтва.

Праўда, у адрозненне ад сваіх суседзяў, беларусы найбольш прывязаны да вёскі. Гэта наша асаблівасць. І, з'ехаўшы з родных мясцін, мы яшчэ на працягу некалькіх пакаленняў застаёмся палешукамі, чэрвенцамі, івянецкімі альбо «з-пад Браслава». Тыповыя для ўсіх постсавецкіх краін дачы для нас хутчэй не спроба вырошчваць гародніну і не летні дамок. Бадай, не толькі гэта, а нейкая сакральная сувязь з векавечнай народнай традыцыяй. Сувязь з вёскай. Але з кожным пакаленнем гэта сувязь становіцца слабейшай. Сялянскі народ стаў гарадскім.

Вадзім ГІГІН.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Интеграл» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

административно-хозяйственного здания,

об. пл. 149,3 кв.м, инвентарный номер 500/С-855, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 105, корп. 3.

Начальная цена с НДС – 4 080 000 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,0386 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 31.05.2013.

Аукцион состоится **03.09.2013** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.09.2013** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.

Уважаемые акционеры ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

13 августа 2013 года состоится внеочередное общее собрание акционеров

ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»,

расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70 (конференц-зал)

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О выплате дивидендов по итогам работы Общества за 2012 год.

Начало работы собрания **в 12.00.**

Регистрация участников собрания **с 11.00 до 11.50.**

Наблюдательный совет ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

УНП 500021638

ОАО «Стройдетали»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 14 августа 2013 года ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА по адресу: г. Вилейка, ул. Стахановская, 134, помещение столовой.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Внесение изменений в устав общества.
2. Утверждение цены выкупа акций в случае возникновения права выкупа акций по требованию акционеров.

Списки акционеров на участие в собрании — по состоянию реестра на 12 августа 2013 года.

Начало собрания в 10.00.

Время регистрации 9.00—9.50.

Для регистрации акционерам иметь при себе паспорта, представителям акционеров — паспорта и доверенности.

Справки по тел. (8 01771) 2 25 48.

УНП 600246748

15 августа 2013 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лунинецлес».

Повестка дня:

1. Об изменении размера уставного фонда и номинальной стоимости акций ОАО «Лунинецлес».
2. О внесении и утверждении изменений в устав общества.

Местонахождение ОАО «Лунинецлес»: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Место проведения собрания: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 08.08.2013 г. (с 10.00 до 13.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200251040

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

БОЛЬШАСЦЬ ДОЎГАЖЫХАРОЎ — ЖАНЧЫНЫ

555 жыхароў Беларусі перасягнулі 100-гадовую планку, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Стагадовы рубеж, па звестках на 1 ліпеня, пераадолелі 479 жанчын і 76 мужчын. Такім чынам, прадстаўніцы «слабага» полу традыцыйна лідзіруюць сярод беларускіх доўгажыхароў, на гэты раз з шасціразовай перавагай. Прычым, як адзначыла **начальнік аддзела па справах ветэранаў і інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана ЕРМАКОВІЧ,** ва ўзроставай катэгорыі старэй за 110 гадоў — толькі жанчыны (9 чалавек).

Больш за ўсё жыхароў ва ўзросце больш за 100 гадоў у Гродзенскай вобласці (117 чалавек). На другім месцы — Мінская (98), на трэцім — Брэсцкая (94). У Віцебскай вобласці пражывае 81 доўгажыхар, у Гомельскай — 66, у Магілёўскай — 52, у Мінску — 47.

Надзея ДРЫЛА.

АПЛАТА «КАМУНАЛКІ» Ў АЎТАМАТЫЧНЫМ РЭЖЫМЕ

У трымальнікаў банкаўскіх плацежных картак Беларусбанка з'явілася новая магчымасць аўтаматычнай аплаты камунальных паслуг праз Цэнтр інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама», а таксама паслуг РУП «Белтэлекам» byfly, ZALA, стацыянарны тэлефон) з дапамогай паслугі «Аўтааплата». Раней банкам была рэалізавана магчымасць аўтааплаты мабільнай сувязі (MTC, life і Velcom).

Уладальнікі банкаўскіх плацежных картак, якія карыстаюцца гэтай паслугай, ужо могуць не турбавацца пра стан балансу мабільнага тэлефона альбо запазычанасць па камунальных паслугах. Неабходны плацеж будзе здзейснены ў аўтаматычным рэжыме, патрэбная сума грашовых сродкаў спішацца з рахунку банкаўскай аплатнай карткі, а яе трымальніку прыйдзе SMS-паведамленне з абвесткай на нумар тэлефона, пазначаны пры рэгістрацыі паслугі.

Зарэгістраваць паслугу «Аўтааплата» магчыма ў любым інфакіёску банка, а для аўтааплаты паслуг апаратараў мабільнай сувязі — таксама з выкарыстаннем «М-банкінгу».

Сяргей КУРКАЧ.

ПАЧАЛІ ПРЫМАЦЬ ЯБЛЫКІ

Арганізацыі спажывецкай кааперацыі распачалі нарыхтоўку яблыкаў ад насельніцтва. Згодна з апошнімі аператыўнымі звесткамі Белкаапсаюза, іх ужо нарыхтавана 2,5 тысячы тон. Пакуль лепшыя вынікі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Тут, адпаведна, закуплена ў насельніцтва 0,9 тысячы тон і 1,3 тысячы тон пладоў. Сярэдні закупачны кошт складае 500-700 рублёў за кілаграм.

ТЫДЗЕНЬ МОЖА БЫЦЬ... САЛОДКІМ!

Акцыю «Салодкі тыдзень» вырашыў правесці Белкаапсаюз. З 12 па 18 жніўня яна пройдзе ў кожным універсаме спажывецкай кааперацыі Мінска, абласных і раённых цэнтрах, буйных населеных пунктах.

«Салодкі тыдзень» — гэта дэгустацыя кандытарскіх вырабаў: цукерак, карамелі, шакаладу, пячэння, пернікаў, пірожных, тортаў, марожанага і г.д. Шырокі асартымент такой прадукцыі па прывабных цэнах прадаставяць вядучыя айчынныя вытворцы. Паралельна будуць вывучацца густы пакупнікоў, каб у далейшым запаўняць паліцы ў крамах найперш упадабанымі спажыўцамі салодкімі таварамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЫРЭКТАР «ЛАГОЙСКРАЙГАЗА» АСУДЖАНЫ ЗА ВЫБУХ У ЛАГОЙСКІМ РАЁНЕ

Вынесены прысуд па справе аб выбуху газу ў жылым доме ў вёсцы Малінаўка Лагойскага раёна.

— Дырэктар і старшы майстар установы «Лагойскрайгаз» прызнаныя вінаватымі па арт. 428 КК (службовая халатнасць), — паведаміла старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна Калініна. — Кожны з іх асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі ў калоніі-пасяленні з пазбаўленнем права займаць кіруючыя пасады тэрмінам на 5 гадоў.

Нагадаем, што інцыдэнт адбыўся летась 8 лютага ў трохпавярховым трохпад'ездным інтэрнаце. У выніку выбуху абрынуліся перакрыцці пад'езда будынка. Адзін чалавек загінуў, двое атрымалі цяжкія цялесныя пашкоджанні.

Прычынай выбуху, паводле слоў Таццяны Калінінай, стала ўзгаранне газапаветранай сумесі, якая ўтварылася з-за ўцечкі газу з сістэмы газазабеспячэння дома. Кіраўніцтва «Лагойскрайгаза» праявіла халатнасць і не зрэагавала на неаднаразовыя паведамленні жыхароў, у тым ліку і ў дзень выбуху, пра аварыйныя інцыдэнты.

Надзея ДРЫЛА.

ПРЫЙШОЎ НА ПЛЯЖ — НЕ ПІ І НЕ СПІ

Падчас чарговага рэйду па месцах масавага адпачынку грамадзян да супрацоўнікаў Цэнтральнага РУУС сталіцы звярнуўся выпадковы сведка, які паведаміў, што непадалёку ў траве знаходзяцца мужчыны, якія дрэнна сябе адчуваюць: не разлічылі з алкаголем. Міліцыянеры сапраўды знайшлі ва ўказаным месцы двух грамадзян сярэдніх гадоў, якія спалі. Той жа мужчына дадаў, што некалькі хвілін таму невядомы забраў партфель аднаго з іх.

Зламыснік не паспеў далёка адысці — яго затрымалі. У партфелі аказаліся мабільны тэлефон і важныя асабістыя дакументы, на аднаўленне якіх уладальніку давялося б патраціць шмат часу. Сам пацярпелы нічога патлумачыць не змог: ад спёкі і выпітага ён дрэнна сябе адчуваў. Міліцыянерам нават давялося выклікаць на месца здарэння медыкаў.

У гэтай сувязі варта нагадаць простыя правілы, каб іншыя не патрапілі ў аналагічную сітуацыю. Не бярыце з сабой на пляж дакументы і вялікія сумы грошай. Не варта браць каштоўныя ўпрыгажэнні: існуе, вядома ж, рызыка згубіць іх; акрамя таго, яны прыцягваюць увагу зламыснікаў. Пажадана не браць з сабой і мабільныя тэлефоны, планшэты, фотаапараты і іншыя дарагія рэчы. А калі ўзялі, не выпускайце іх з поля зроку. Не кладзіце рэчы за спінай. Нават нечым прыкрытыя, яны ўсё адно могуць прыцягнуць чужую ўвагу. Яшчэ міліцыянеры нагадваюць: ніколі не спіце на пляжы, прыкрыўшы твар. І, вядома ж, не трэба ўжываць алкаголь. Той, хто адпачывае нападпітку, можа не толькі стаць ахвярай злачынцаў, але і сам патрапіць пад адказнасць перад законам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЛЕГКАВІКІ РАСПЛЯСКАЛІСЯ Ў БЛІН

2 жніўня раніцай у Магілёўскім раёне, паблізу вёскі Еўдакімавічы, загінуў мужчына ў выніку сутыкнення легкавога аўтамабіля з фургонам, які перавозіў хлеб.

Вадзіцель «Фольксвагена», паводле аператыўнага паведамлення Магілёўскай ДАІ, не справіўся з кіраваннем, выехаў на сустрэчную паласу і ад удару аўтамабіляў атрымаў смяротную траўму. Мужчыну 1976 года нараджэння заставаліся літаральна суткі да дня нараджэння... Ад сутыкнення аўтамабіляў, дакладней — ад разлёту асколкаў, пацярпеў і трэці аўтамабіль — мікрааўтобус. Абставіны дарожнага здарэння высвятляюцца.

Як і яшчэ аднаго, якое адбылося ўвечары 31 ліпеня ў Бабруйску. У цэнтры горада на вуліцы Мінскай «ВАЗ-2109» выехаў на сустрэчную паласу і ўдарыўся ў фуру. Аўтамабіль не вытрымаў удару: кіроўца 1980 года нараджэння загінуў, пасажыр трапіў у бальніцу.

Алена КАЗЛОВА.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму спецыялісту аддзела аўтаматызаванай падрыхтоўкі дакументаў Упраўлення інфармацыйных тэхналогій Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Чукіла Святлане Анатольеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — заўчаснай смерцю СЫНА.

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному медицинскому страхованию иностранных граждан и лиц без гражданства, временно пребывающих или временно проживающих в Республике Беларусь формы 2РН серии БВ № 2822134 **считать недействительным.**

УНП 101883943

ЖАНВІЛЬСКІЯ БЕЛАРУСЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У тым, што назва Жанвіль мае французскае паходжанне, няма ніякага сумневу. Не, па-французску з мясцовых ніхто не размаўляе і з Францыяй дыпламатычных і проста чалавечых зносін тут не наводзяць. У мясцовым СВК не вырабляюць французскіх сыроў і не разводзяць жаб на далікатэсныя стравы. Падставу меркаваць пра французскае паходжанне даюць назвы-цёзкі. А іх нават некалькі:

1. Жанвіль — камуна (кантон) у дэпартаменце Кальвадос (Ніжняя Нармандыя).

2. Жанвіль — камуна ў дэпартаменце Эр і Луар (Цэнтр).

3. Жанвіль — камуна ў дэпартаменце Уаза (Пікардыя).

4. Жанвіль-сюр-Жуін — камуна ў дэпартаменце Эсан (Іль-дэ-Франс).

А яшчэ Жанвіль — гэта палац XVII ст. у камуне Палюэль (Верхняя Нармандыя), імя французскай пісьменніцы Мартэль дэ Жанвіль і мадэльера Элена Жанвіля. І нават біёлаг Кох, які адкрыў сухотную палачку, насіў імя Жанвіль.

Дакументальнага пацверджання версіі «хрышчэння» Жанвіля не існуе. Але мясцоваму насельніцтву найбольш даспадобы колішняя гісторыя, дакладнасць якой з цягам часу сцерлася з памяці і ператварылася ў легенду пра рамантычную гісторыю кахання. Па тутэйшых расповядах, у Айчынную вайну 1812 года мясцовая сялянка знайшла параненага француза, схавала яго ад пераследу, выхадзіла і стала яго жонкай. Неўзабаве адзін з хутароў, які пазней стаў маёнткам, атрымаў назву Жанвіль, што ў перакладзе азначае «Іванаў горад». Нават расійскі палітык, дэпутат, паэт, колішні сябар генсека Гарбачова Анатоль Лук'янаў (ён паходзіць са Смаленшчыны), пад уражаннем гэтай кранальнай легенды прысвяціў Жанвілю свой верш:

«Когда драгун Наполеона,
Окоченев, упал с седла,
Его российская мадонна
К себе в деревню привела.
Согрела, вымыла, одела.
Хмельного поднесла стакан.
«Как звать тебя, солдатик смелый?»
Он, помолчав, ответил: «Жан».
Метели армию косили,
Бежала без оглядки рать.
А он остался здесь, в России,
Не стал колонну догонять.
Катилось за зимою лето
От родины за тыщу миль.
Драгун назвал деревню эту
Французским именем — «Жанвиль»...

Магчыма, гэтага напалеонаўскага драгуна сапраўды звалі Жанам, магчыма, ён быў жыхаром аднаго з вышэй пералічаных Жанвіляў і заснаваў яшчэ адзін на зямлі, якая ў той час уваходзіла ў склад Магілёўскай губерні (пасля Трэцяга раздзелу Рэчы Паспалітай). Як некалі эмігранты засноўвалі пасёлкі і вёскі і давалі ім назвы сваіх айчынных гарадоў, магчыма, гэтак з'явілася на славянскіх землях паселішча з раманскай назвай. Нездарма ў свеце існуе некалькі Лонданаў, ёсць тры Масквы, нават два Полацкі і два Слуцкі.

Аднак мясцовыя краязнаўцы і журналісты расійскіх газет любяць прыводзіць яшчэ адну версію паходжання назвы населенага пункта. Маўляў, па-беларуску «ежевика» называецца «жавінка». Магчыма, у мясцовых беларускіх гаворках ажыны так і называюцца. Аднак гэтая версія толькі падмацоўвае думку пра беларускія карані Жанвіля. Тым больш калісьці гэтыя землі ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, і жылі там продкі сённяшніх жанвільцаў.

Першае, што мяне здзівіла, калі трапіў у Жанвіль, — аўтамабіль з дзяржнумарам з Мінскай вобласці. Адкуль, з якой нагоды? Разгадка аказалася простай: на некалькі дзён з горада Жодзіна да сваёй маці разам з жонкай і 5-гадовым сынам прыехаў адпачыць Віталь Лукашэнкаў. Дарога Жанвіль — Жодзіна складае 360 кіламетраў, таму Віталь госць тут не часты. Горад беларускіх аўтамабілебудаўнікоў стаў для маладой сям'і больш прывабным, чым расійская ўскраіна на беларускім памежжы.

— Магчыма, мы б жылі ў Жанвілі, але тут няма ніякай перспектывы, — кажа Віталь. — Школа закрылася, газ да вёскі не давялі, сельсавет ліквідаваны. А галоўнае — няма працы, механізатары і тыя ў пастухі ідуць.

Першага сустрэчнага жанвільскага беларуса я заспеў за цырульніцкай справай — Уладзімір Карпенка падстрыгаў свайго аднавяскоўца Валерыя Іванова.

— У Жанвілі жыву больш за 30 гадоў, прыехаў з суседняй беларускай вёскі Засожжа, жаніўся, — распавядае Уладзімір Ільіч. — Калі Саюз разваліўся, давялося ўзяць расійскае грамадзянства, каб не лічыцца нелегалам.

Пакуль беларус Карпенка змагаўся на працоўным фронце жанвільскага СВК «Звязда» ў якасці трактарыста, яго аднавясковец Іваноў нёс воінскую службу ў Яраслаўлі, Белгарадзе, Рыбінску. Спрачацца, чыя радзіма лепшая, сэнсу ім цяпер ну ніякага няма, бо да скону веку застануцца жанвільцамі і выручаць адзін аднаго ў розных жыццёвых абставінах. А моладзь з'язджае — хто ў недалёкі райцэнтр Хіславічы, хто ў абласны Смаленск. Нехта і на Маскву цэліць.

— У Жанвілі 204 жыхары. Асноўны статус насельніцтва можна вызначыць па назвах падпісных выданняў, якія развозіць па вёсцы паштальён Валянціна Карпенка (дарэчы, жонка беларуса Уладзіміра Карпенкі). Найбольшым попытам карыстаюцца газеты «Пенсионер Смоленщины» і «Смоленская дешёвая». Летам, як звычайна, вясковае насельніцтва павялічваецца за кошт гарадскіх дзяцей на канікулах. Па вёсцы мяне суправаджаюць тры сябрукі на веласіпедах. Адзін з іх, 9-гадовы Сяргей Ратуеў, прыехаў да бабулі са Смаленска, не без гонару кажа, што яго дзед — беларус. У 16-гадовай Кацярыны Гурчанкі, якая ўлетку ахвотна дапамагае сваёй бабулі па гаспадарцы, бацька нарадзіўся ў Парадзіне, таму яна таксама беларуска.

Вёска Парадзіна знаходзіцца за Сожам. Дарога да яе, самая кароткая з Жанвіля ў Беларусь — 7 кіламетраў. Але даехаць да моста праз раку можна толькі ў сухое надвор'е на матацыкле, трактары альбо кані. Парадзінскіх хлопцаў гэта не надта бянтэжыць, і яны гатовыя нават на веласіпедах дабірацца да сваіх жанвільскіх сябровак і нявест. Не ехаць жа ўкругаля праз Мсціслаў і Хіславічы за добрых 70 кіламетраў?! А яшчэ прасцей — пазваніць, таму што мабільная сувязь у рускім Жанвілі цалкам беларуская. Тут і Вэлком, і МТС працуюць на поўную антэну. Праўда жанвільцам гэта не вельмі зручна, бо званіць па Расіі трэба з дапамогай роўмінгу, альбо мяняючы сім-картку.

Нават такія дробныя нязручнасці, як дарога і сувязь, часта даюць падставу старэйшым жыхарам для настальгіі па ранейшым жыцці, калі межы былі ўмоўнымі, а грамадзянства нікога не цікавіла. Калі рускія і беларусы касілі сена на адным полі, купаліся ў адной рацэ і спявалі адны і тыя ж песні.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.
Хіславіцкі раён, Смаленская вобласць.



■ Рэха падзеі

У Віцебску памятаюць пра Севастопаль

Яны сабраліся ў Віцебску, бо амаль усе тут і жывуць, дачакаліся некалькіх гасцей з Мінска, пагрузілі ўсе рэчы ў зафрахтаваны аўтобус — што было даволі складанай — і ўзялі курс на Севастопаль, дзе іх чакалі.

Як бы нічога дзіўнага. Летам з нашага краю многія імкнуцца на мора, за няблізкі свет.

Гэтыя чатырнаццаць беларусаў, што служылі ў свой час ваеннымі маракамі, даўно рыхтаваліся да паездкі.

Грамадскі рух «Марское брацтва — непарушна», які аб'ядноўвае ветэранаў ваенна-марскога флоту, вядомы разнастайнымі мерапрыемствамі ваенна-патрыятычнай скіраванасці. Магчыма, у многім дзякуючы іх памкненням грамадства змагло даведацца, якая славутая марская гісторыя ў сухапутнай Беларусі! Толькі за пасляваенны час сотні тысяч землякоў зведалі службу на савецкім ваенным флоце. Служылі добрасумленна, некаторыя па-геройску, а 70 беларусаў нават даслужыліся да высокіх адміральскіх званняў. Некаторыя служаць і да гэтай пары, праўда, ужо на расійскіх ці ўкраінскіх баявых караблях.

Вось такая наша самая свежая марская гісторыя.

А ёсць і больш даўняя. Звязаная з падзеямі Крымскай вайны, дзе наш след таксама адметны. Ажно 8 імянных беларускіх палкоў змагаліся тады за Севастопаль. Мінскі полк, які палёг амаль поўнасцю, Віцебскі, Полацкі, Брэсцкі... Пра іх подзвігі ў горадзе-герої не забываюць, назвы палкоў выбіты на ганаровых шыльдах у самым цэнтры.

Беларускія ветэраны флоту даўно выношвалі задумку ўшанаваць памяць землякоў, палеглых у час геройчнай абароны Севастопаля, знакам з роднай зямлі. Ад задумак перайшлі да канкрэтных дзеянняў. У сябе на радзіме вырабілі стаўны крыж з сасны і металу, аздобілі, ахрысцілі — і павезлі ў край, дзе знайшлі вечны спакой салдаты і маракі беларускіх палкоў.

Пра тое, як выраблялі гэты крыж, можна расказваць асобна. Справа нясцростая, ды і нятанная.

Як яго рыхтавалі да транспартавання, як везлі — цяжэразны, велічны, амаль у восем метраў вышынёй, ды праз жорсткія дзяржаўныя межы, што праляглі сёння паміж брацкімі Беларуссю і Украінай з іх строгімі мытнямі — таксама можна ўспамінаць доўга.

Пра тое, як дамаўляліся аб установцы з севастопальскай уладай і з кіраўніцтвам флотаў дзвюх дзяржаў — трыма бакамі, дзе ў кожнага свая праўда, — і тут можна цэлы раман пісаць.

Але ўсё вырашылі нашы людзі. І справу давялі да канца.

Можа, таму, што флот добра загартоўвае людзей і іх характары, таму, што справа ў іх такая, хрысціянская, і, на жаль, вельмі рэдкая для нашага празаічнага часу.

А яшчэ так склалася, што абодвума флотамі на Чорным моры — што расійскім Чарнаморскім, што Ваенна-марскімі сіламі Украіны, — камандуюць сёння нашы землякі-беларусы. Ураджэнец Віцебска Аляксандр Вітко і Юрый Ільін, які паступаў вучыцца ў марское вучылішча з Рагачова. Падчас нашага прыезду адмірал Ільін быў не тое што заняты... Якраз суправаджаў сваё самае высокае начальства — міністра абароны і прэзідэнта краіны. Вы разумееце, які ў камандуючага флоту быў дэфіцыт часу. Але, нягледзячы ні на што, адмірал адарваўся на хвіліну ад высокіх гасцей, каб паціснуць рукі нашым маракам і сфатаграфавацца разам. Вельмі моцны поціск рукі ў яго, дарэчы, — як-ніяк, у марской пяхоце служыў.

— Я заўсёды памятаю, адкуль я. Я ж з Рагачова, хлопцы.

Усе двое сутак, якія мы правялі ў Севастопалі, цёплае ласкавае мора вабіла вока. Але акунуцца ў яго хвалі так і не давялося. Падрыхтоўка месца пад крыж на стромкім скалістым беразе ў цэнтры горада — а менавіта там нашы дабіліся месца пад памятны знак — аказалася справай няпростай у інжынерным сэнсе. І спачатку пайшла крыху не так, як бачылася ў сухапутным Мінску. Давялося папацець. Ніякія спецыяльныя машыны на дапамогу не маглі дабрацца, нават простыя рыштаванні не было куды ўціснуць — усё рабілі на руках. Выручаў і Чарнаморскі флот, маладыя рукі яго матросаў дапамагалі нашым ветэранам падняць і замацаваць крыж на скале.

Асабіста спрыяў справе яшчэ адзін наш зямляк — намеснік камандуючага Чарнаморскім флотам капітан першага рангу Юрый Арэхоўскі: ён родам з Бялыніч.

Здзейсненае беларусамі мерапрыемства было ўключана ў праграму святкавання Дня Ваенна-марскога флоту ў Севастопалі. На яго сышліся як высокія чыноўнікі, так і простыя людзі.

— Я спецыяльна прыехаў сюды, калі даведаўся, што сабраліся зрабіць беларусы, — сказаў нам былы ветэран Паўночнага флоту з Пецярбурга Мікалай Анісаў. — Надта ж гэта падзея незвычайная.

Што ідэя з такім вось помнікам, здзейсненая на грамадскіх пачатках, — вельмі незвычайная для нашага часу, на ўрачыстасцях гаварылі многія: простыя севастопальцы. Афіцэры штабоў абодвух флотаў. Гарадскія ўлады. І прадстаўнікі беларускай дыяспары, якія жывуць у гэтым горадзе.

— Мы рады кожнай сустрэчы са сваімі землякамі, — сказала Ала Гарэлікава, старшыня севастопальскага аб'яднання беларусаў. — А тым больш з маракамі. Бо яны для нашага горада — асаблівыя людзі. Мы вельмі ганарымся гэтай справай. І, вярнуўшыся на Радзіму, беларускія маракі хай будуць спакойныя за здзейсненае. Мы будзем прыглядваць за гэтым крыжам, за гэтым святым месцам.

Дарэчы, размаўляла яна з намі на чысцюткай беларускай мове. Хоць даўным-даўно, маладой дзяўчынай, з'ехала сюды з роднага Полацка.

Наогул, Севастопаль літаральна цесны ад беларусаў. Калі нашы ў дзень флоту, пераапрануўшыся ў ваенную форму ды з нацыянальнымі сцягамі прайшлі па горадзе, ім там мясцовыя жыхары ды і нашы турысты літаральна праходу не давалі.

Пасялілі гасцей на флоцкім судне «Енісей». Капітан якога — што тут ужо дзівіцца — таксама аказаўся пінчанінам.

А беларуская дэлегацыя, дарэчы, даволі незвычайнай. Хоць даўно ўсе сваё адслужылі — але дзе і як? Камандзір экіпажа, падводнік, глыбакаводны вадалаз, камандзір атрада пагранічных караблёў, марскія дэсантнікі — вось скупы пералік іх пасад на флоце... І ва ўсіх да гэтай пары — вернасць той службе. У дэлегацыі быў толькі адзін «немарак» — афіцэр запасу Аляксандр Галубовіч з фонду «Памяць Афгана» — былыя воіны-«афганцы», як могуць, падтрымліваюць справу «Марскога братэрства», не лічаць яе «не сваёй».

За плячыма лідара і каардынатара гэтага руху Арсенія Крыцкага разведвальны батальён дывізіі марской пяхоты на Цікім акіяне. Той, хто вынес на сваіх плячах практычную рэалізацыю ідэі, — Юрый Кужалеў (тэрміновую службу адслужыў на Паўночным флоце). Цяпер у яго свая справа ў Віцебску. Ведаю многіх бізнесменаў, якія шмат гавораць пра неабходнасць добрых спраў, але хоць капейку дастаць на гэта з уласнай кішэні — рука ў іх не падымаецца. Юрый не з такіх. Не толькі падставіў плячо праекту, але і паехаў ставіць крыж уласнаручна. Сам бачыў, як ён збіраўся, як няпроста было яму адарвацца ад працы на гэтыя гарачыя летнія дні. Але ўсё кінуў і паехаў.

Цырымонія адкрыцця помніка ад беларусаў атрымалася прыгожай і шчымлівай. Паклонны крыж паўстаў якраз на тым пятачку, дзе калісьці кіпелі жорсткія баі. Што ў часы Крымскай вайны, што ў пару Вялікай Айчыннай. На марскім беразе выстраіліся роты ганаровай варты і аркестры ад абодвух флотаў — расійскага і ўкраінскага. Сабралася шмат высокіх ганаровых гасцей і духоўных саноўнікаў. Прыйшлі звычайныя севастопальцы, у тым ліку прадстаўнікі нашай тутэйшай дыяспары ў традыцыйных касцюмах.

Хвалі Чорнага мора ціха біліся аб узбярэжныя камяні. Над морам гучалі высокія словы пра той далёкі подзвіг. І малітва за душы тых беларускіх сыноў, хто пахаваны ў гэтай зямлі.

Будзеце ў Севастопалі — убачыце гэты крыж. Яго добра відаць праз заліў насупраць Графскай прыстані, бо стаіць у маляўнічым кутку Паўлоўскага мыса, крыху ніжэй флоцкага шпіталя. Відаць і ўначы, бо зрабілі падсветку. Побач на флагштоках лунаюць дзяржаўныя сцягі Беларусі, Расіі і Украіны.

Якраз паўз гэтае месца выходзяць баявыя караблі несці службу ў Сусветны акіян. Велічны крыж з векавой беларускай сасны — гэта напамін і сённяшнім маракам, што Радзіма памятае пра ўсіх сваіх сыноў, хто мужна змагаўся, абараняючы гэты куток ад ворагаў, і назаўсёды застаўся тут.

Вікенцій КЛЮЧНІК.
Мінск — Віцебск — Севастопаль — Віцебск — Мінск

■ Футбол

ТУРЭЦКАЯ ПАДНОЖКА

Беларускія каманды з аднолькавым лікам (0:1) саступілі ў першых матчах 3-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы.

На гадзінніку аўстрыйскага рэферы Рэнэ Айснэра ўжо беглі дадатковыя хвіліны, калі з трыбуны брэсцкага стадыёна «Брэсцкі» на поле паляцелі бутэлькі з колай і мінералкай. Вокамгненна на зялёным пляцы ўтварыўся гармідар з футбалістаў і арбітраў. Нехта штурхаўся, крычаў, паказваў чырвоныя карткі, ляжаў на траве, а нехта з туркаў пачаў дапамагаць суддзі збіраць з газона пластыкавую тару: маўляў, глядзіце, якія ў Беларусі гасцінныя балельшчыкі! Матч мінскага «Дынама» з турэцкім «Трабзанспорам», які з-за адсутнасці годнага стадыёна ў сталіцы праводзілі ў горадзе над Бугам, упэўнены, балельшчыкам спадабаўся, але падстаў для радасці пасля яго ў хлопцаў Роберта Маасканта сапраўды няшмат.

Гульня скончылася так, як гэтага жадаў трэнерскі штаб «Трабзанспора». Не, я не маю на ўвазе тую бойку на апошніх хвілінах, аднак, здаецца, і гэты кампанент сустрэчы туркі могуць разглядаць цалкам пазітыўна. Па-першае, бой замарудзіў атакуючы рытм гаспадароў, зацягнула час, па-другое, з поля быў выдалены асноўны форвард «блакітна-белых» Лазар Весялінавіч. І калі выдаленне, адсутнасць у паўторным матчы аргенцінца Густава Колмана яны перажывуць, знайсці дынамаўцам годную замену свайму Лазару будзе вельмі цяжка. Менавіта ён стварыў для «Дынама» самы востры момант у гэтай сустрэчы. У метрах трыццаці ад уладанняў гасцей Весялінавіч паспрабаваў адарвацца ад назойлівага абаронцы — не атрымалася. Аднак балканец працягнуў яго на сабе яшчэ крыху, і ўжо на штрафной пляцоўцы нізам стрэліў па варотах — штанга! У адрозненне ад беларусаў, «чарнаморскія штормы», як ахрысцілі падапечных Мустафы Акчая родныя балельшчыкі, сваёй магчымасцю скарысталіся. Па сутнасці, гуляла гэтая каманда, за якую выступае французская «зорка» Фларан Малуда, неяк непаспешліва. Быццам адштурхоўваліся ад таго, што першынство Турцыі яшчэ не стартавала, а таму цягацца ўвесь матч на роўных хуткасцях з добра падрыхтаванымі беларусамі ім будзе яшчэ складана. У другой палове туркі наогул адкрыта цягнулі час, атрымлівалі жоўтыя карткі, але працягвалі гнуць сваю лінію. Праўда, «Трабзанспор» — гэта не толькі футбольны артыстызм, аднак і добрая турэцкая каманда, гуляць з якой у гасцях будзе вельмі складана. Толькі дынамаўскі коўч аптымізму не губляе. «Лічу, у нас добрыя шанцы ў Трабзоне, каб перамагчы, — прызнаўся пасля сустрэчы Мааскант. — Тым больш у гасцях мы гуляем лепш, чым дома».

У падобную сітуацыю трапіў і «Мінск», які ў Гродне мінімальна саступіў трэцяй камандзе Шатландыі «Сэнт-Джонстану». Розніца толькі ў тым, што «Трабзанспор» — сапернік больш вядомы, чым сціплыя хлопцы з 50-тысячнага гарадка Перт. Матчы ў адказ адбудуцца 8 жніўня. Шанцы, каб прайсці далей, безумоўна, нашы суайчыннікі маюць, але нешта падказвае: каб матэрыялізаваліся іх мары, хлопцам трэба згуляць удвая лепш, чым рабілі гэта дома.

Тарас ШЧЫРЫ

■ Баскетбол

РАТАВАЛЬНЫ МІНІМУМ

Беларуская мужчынская зборная па баскетболе з перамогі стартавала ў кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы-2015. Першымі сапернікамі падапечных Руслана Байдакова былі венгры — яўныя аўтсайдары ў сваёй кваліфікацыйнай групе. Тым не менш госці, здаецца, здзівілі ўсіх прысутных у мінскім Палацы спорту, упэўнена павёўшы ў першай палове сустрэчы. Асабліва атрымліваліся ў венгерскіх баскетбалістаў трохачковыя кідкі. На гэтым фоне беларускія спартсмены выглядалі зусім бездапаможна: у канцоўцы стартавай чвэрці хлопцы папросту перасталі набіраць ачкі! У другой чвэрці падапечныя Руслана Байдакова крыху скарацілі адставанне, але зрабіць лік роўным атрымалася толькі ў пачатку другой паловы матча. Здавалася, гульня ў беларусаў наладзілася — падправілася рэалізацыя атак, больш удала сталі дзейнічаць «вялікія» баскетбалісты. Але па-ранейшаму заставаліся праблемы на падборы і ў гульні на чужой палове пляцоўкі.

Апошняя чвэрць сустрэчы вартая баскетбольнага «Оскара» за драматызм і інтрыгу. Беларусы вельмі хутка вырваліся наперад, зарабіўшы грунтоўную перавагу ў трынаццаць ачкоў. Нарэшце сталі атрымлівацца трохачковыя кідкі, з'явіліся блокшоты і перахопы, прайшло некалькі хуткіх атак... Але на апошніх хвілінах матча нашы спартсмены страцілі канцэнтрацыю і дазволілі сапернікам падабрацца на небяспечны мінімум у чатыры ачкі. Дзякуй, сірэна прагучала якраз своечасова. На табло прыемны лік — 79:75.

Галоўны трэнер нацыянальнай баскетбольнай зборнай Руслан Байдакоў заявіў, што застаўся незадаволеным гульнёй сваіх падапечных: «У канцы сустрэчы мы павінны былі памнажаць перавагу. Замест гэтага выпусцілі ініцыятыву і дазволілі сапернiку вярнуцца ў матч. Трэба разумець, што 4 ачкі пры роўнай гульні — гэта вельмі маленькі адрыў. Усё магло б быць і не на нашу карысць. Так што ў нас шмат работы!» Таксама Байдакоў пракаментаваў рашэнне не выклікаць у зборную вопытных гульцоў: «Зразумела, што і Дзяніс Коршук, і Аляксей Лашкевіч маглі б дапамагчы. Але нам трэба «амалоджваць» зборную, мы і так спазняемся ў гэтым кірунку. Гэта быў свядомы крок па 50-працяжным перааснашчэнні каманды».

Відавочна, целкам адэкватны ход, здольны працаваць на перспектыву. І статыстыка матча гэта пацвярджае: двума самымі рэзультатыўнымі гульцамі сталі маладыя баскетбалісты — Віталь Лютыч і Арцём Парахоўскі, якія набралі 17 і 14 ачкоў адпаведна.

Наступны матч беларуская дружына правядзе 7 жніўня супраць каманды Славакіі.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■ Ну і ну!

ГАЛАНДЗЕЦ ЗРАБІЎ ЛЯТАЮЧАГА СТРАУСА

Жыхар Нідэрландаў Барт Енсэн распрацаваў лятаючага страуса. Для гэтага ён здабыў на ферме мёртвую птушку, аднёс яе да таксідэрміста, пасля чаго забяспечыў пудзіла рукавікамі і прапелерамі. Паводле слоў Енсэна, яму вельмі хацелася зрабіць лятаючага страуса, паколькі насамрэч гэтая птушка не ўмее лётаць. Паветранае судна атрымалася каля трох метраў у даўжыню і важыць крыху больш за 46 кілаграмаў. Першы тэставы палёт страуса адбыўся некалькі дзён таму, выпрабаванне прайшло паспяхова. Раней галандскі вынаходнік ужо распрацоўваў незвычайныя аб'екты — у 2012 годзе ён прадэманстраваў лятаючага ката, якога вырабіў з чучала свайго гадаванца. Як і ў першым выпадку, Енсэну дапамагаў ажыццявіць праект інжынер Ар'ен Белтман. Цяпер пара працуе над паліто з вожыкаў, што загінулі на аўтамагістралях

НА БУСЛОЎ ЦЯПЕР СПАДЗЯВАЦЦА НЕ ВАРТА

Плануеце папаўненне ў сям'і? Забудзьцеся на выпадковы прылёт бусла і раптоўныя знаходкі ў капусце. Да такога адказнага кроку трэба рыхтавацца. Прычым абаім. Упэўненасць у тым, што ў вас усё добра, можа быць падманлівай. Першае дзіця або трэцяе — таксама не важна. Шторах падыходзьце да «справы» з усёй адказнасцю. У першую чаргу, зразумела, жанчыне неабходна прыйсці на прыём да свайго ўчастковага тэрапеўта і гінеколага. Урач-тэрапеўт дапаможа высветліць, ці няма супрацьпаказанняў да планавання цяжарнасці, выявіць хранічныя захворванні. Важна звяртаць увагу на наяўнасць цукровага дыябету, артэрыяльнай гіпертэнзіі, захворванняў нырак і інш. Гэтыя паталогіі маюць патрэбу, кажучы прафесійнай мовай медыкаў, у кампенсацыі — дасягненні такога стану, калі цяжарнасць будзе дапушчальнай для гэтай жанчыны. Узровень цукру, артэрыяльны ціск павінны быць у норме. У процілеглым выпадку цяжарнасць справакуе больш агрэсіўны варыянт працякання паталогіі.

Задача акушэра-гінеколага — пераканацца, што ў будучай цяжарнай, няма гінекалагічнай паталогіі і інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам. Для гэтага здаюцца мазкі на флору і анкацыталогію. Гінеколаг таксама аглядае малочныя залозы і мерае артэрыяльны ціск. Калі выяўляюцца нейкія гінекалагічныя захворванні або інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, абавязкова трэба пралячыцца. Далей урач парэкамендуе прыём фоліевай кіслаты на працягу 3-4 месяцаў да запланаванай цяжарнасці. Фоліевая кіслата спрыяе прафілактыцы паталогій цэнтральнай нервовай сістэмы ў плода. Нават калі ў жанчыны не выяўлена ніякіх праблем з рэпрадуктыўным здароўем, будучаму бацьку таксама рэкамендуецца прайсці прафілактычны агляд і абследавацца на інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, у андролага або ўролага.

Бацькі павінны ведаць, што вельмі важна ў сітуацыі планавання цяжарнасці не прапусціць без лячэння такія інфекцыі, як мікаплазмоз і ўрэаплазмоз, паколькі яны здольны выклікаць ускладненні цяжарнасці — плацэнтарную недастатковасць, заўчаснае выліванне каляплодных водаў, нараджэнне дзіцяці з нізкай вагой і інш. На жаль, выяўленне інфекцый непасрэдна падчас цяжарнасці не дазваляе пралячыць іх тымі прэпаратамі, якімі гэта неабходна рабіць.

Па вялікім рахунку, урач-гінеколаг па месцы вашага жыхарства можа правесці вышэйзгаданае абследаванне і аздараўленне. Аднак існуе і магчымасць абследавання ў іншых спецыялістаў. Ва ўсіх абласных цэнтрах сёння на базе жаночых кансультацый цяпер працуюць кабінеты планавання сям'і. У Мінску — на базе радзільнага дома №2 і Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця». У апошні можна звяртацца і без накіравання, аднак паводле папярэдняга запісу. Акрамя таго, у любой установе аховы здароўя ёсць магчымасць і платнага абслугоўвання.

Права цяжарыць і нараджаць ёсць, безумоўна, у кожнай жанчыны. Тым не менш існуюць медыцынскія паказанні да перарывання цяжарнасці, калі жанчыне супрацьпаказана нараджаць з-за вострай пагрозы яе жыццю. Пры тых жа цяжкіх формах цукровага дыябету, артэрыяльнай гіпертэнзіі, ныркавай недастатковасці, калі захворванне закранае многія органы і сістэмы, урач можа рэкамендаваць перарыванне цяжарнасці. Жанчына мае права не прыслухацца да гэтай рэкамендацыі, аднак яна павінна ўсведамляць, якіх гераічных намаганняў запатрабуе захаванне такой цяжарнасці.

А на пытанні, якія паступілі ад наведвальнікаў сайта www.doktora.by, адказала *галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Святлана САРОКА.*

— г. Магілёў. 33 гады. Цяжарнасць 5 месяцаў. Укусіў клешч. Аналіз паказаў, што клешч быў носьбітам лайм-барэліёзу. Кляшча адарвалі, на месцы ўкусу засталося невялікае пачырваненне, ранку апрацавалі антысептыкам. Ці ёсць небяспека заражэння для маці і дзіцяці? Як лячыць? Вядома, будзем звяртацца да ўрачоў у Магілёве, але хацелася б пачуць і вашу думку...

— Калі клешч аказаўся носьбітам лайм-барэліёзу, то лячэнне праводзіць трэба. Таму вам неабходна звярнуцца да ўрача-інфекцыяніста. Каб трапіць да такога спецыяліста, неабходна спачатку наведаць тэрапеўта па месцы жыхарства.

— Мне 27 гадоў. Прайшоў амаль год пасля маіх першых родаў, а жывот і пупок не прыходзяць у норму. Пупок тырчыць, як на 5-м месяцы цяжарнасці. Вага на сёння 70 кг... Разумею, што трэба худзець, а што рабіць з пупком?

— У вас сапраўды ёсць лішняя вага, і для яе зніжэння трэба адкарэкціраваць харчаванне і рухальную актыўнасць. Што да пупка, то варта было б паказацца ўрачу-хірургу па месцы жыхарства. Можа быць, мае месца пупочная грыжа.

— Мне 23 гады. Месячныя заўсёды ішлі 7 дзён. На гэты раз скончыліся на 4-ты дзень. З дня пачатку і да заканчэння менструацыі было дрэннае самаадчуванне, расстройства страўніка, галаўны боль і моцная стомленасць літаральна праз 2 гадзіны працы. Што гэта можа быць?

— Сур'ёзнага расстройства менструальнага цыклу ў вас не назіраецца. Аднак калі ёсць дрэннае самаадчуванне, расстройства страўніка, то варта паказацца тэрапеўту і высветліць, ці няма абвастрэння, скажам, гастрыту. Адначасова варта ў такіх сітуацыях і пры іх паўтарэнні набываць тэст на вызначэнне цяжарнасці, пасля чаго паказвацца і ўрачу-гінеколагу. Паколькі бывае і так, што цяжарнасць праходзіць без парушэння менструацыі. Тэст жа неабходны па той прычыне, што на самым малым тэрміне цяжарнасці матка будзе вельмі нязначна павялічана, і дыягназ будзе недакладным. Разам з тым не варта рабіць у такіх выпадках ультрагукавое даследаванне. На самым малым тэрміне ў гэтым няма патрэбы. Паводле паказанняў, першае ўльтрагукавое даследаванне праводзіцца толькі на 11-12-м тыдні. Да гэтага моманту — толькі тэст і агляд урача!

— Г. Мінск, Таццяна. 27 гадоў. Пасля сур'ёзнай траўмы ў правым каленным суставе развіўся астэаартроз. Урач прызначаў капсулы тэрафлекса. Стан заўважна палепшыўся. Паўторны прыём тэрафлекса выклікаў праблемы ў страўнікава-кішачным тракце, давялося перайсці на ін'екцыі дону і фізіяпрацэдуры. Эфект ад курса дону быў вельмі непрацяглым. Цяпер пасля перапынку ўрач парэкамендаваў алфлутоп, ін'екцыі... Як з такім захворваннем пераносіцца цяжарнасць? Ці можна не перарываць курс лячэння ў час цяжарнасці і кармлення? Як не даць хваробе прагрэсаваць? Дзе знайсці ўрача-рэўматолага?

— Наогул калі ў жанчын ёсць паталогія, не звязаная з гінекалагічнай сферай, то яшчэ да планавання цяжарнасці неабходна абмяркоўваць усе пытанні з вузкім спецыялістам, у якога жанчына назіраецца па прычыне той ці іншай паталогіі. У гэтым выпадку, калі вы будзеце планаваць цяжарнасць, то трэба будзе ўзгадніць пытанні прыёму прэпаратаў з тым спецыялістам, які прызначаў вам папярэдняе лячэнне — тэрапеўтам ці рэўматолагам. Наогул артроз, калі мы не кажам пра пашкоджанне ўсіх суставаў, не з'яўляецца супрацьпаказаннем да цяжарнасці. Што да ўрача-рэўматолага, то вы можаце пацікавіцца магчымасцю атрымання кансультацыі, напрыклад, у прафесарска-кансультацыйным цэнтры Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Цэнтр працуе на базе Рэспубліканскага цэнтра рэабілітацыі і бальнеалячэння па вул. Макаёнка, 17.

— Ганна. 31 год. Канчатковага дыягназу няма, аднак рэнтген матачных труб паказаў, што яны праходныя. ЛГ/ФСГ =1,2. Інфекцый няма. Спермаграма ў норме, несумяшчальнасці няма. Бясплоднасць — 2 гады. Лячэнне: 3 месяцы — ярына. Авуляцыя адсутнічае. Раяць стымуляцыю кластылбегітам. Калі прычына бясплоднасці — парушэнне работы эндакрыннай сістэмы, то якія асноўныя аналізы неабходна здаць, каб зразумець першасную карціну?

— У вас няма канчатковага дыягназу, а значыць, вы не выявілі прычыну бясплоднасці і, адпаведна, не прайшлі неабходнага лячэння. Прыём ярыны — гэта не лячэнне бясплоднасці, паколькі гэта гарманальны супрацьзачаткавы прэпарат, які, груба кажучы, прызначаецца для таго, каб яечнікі крыху адпачылі, а пасля запрацавалі крыху актыўней. Пакуль вы ўжываеце гэты прэпарат, авуляцыя не надыходзіць, а значыць, зацяжарыць немагчыма. Кластылбегіт стымулюе надыход авуляцыі. Аднак усё гэта без дыягназу праводзіць не рэкамендуецца. Таму вам патрэбна даабследаванне. Ёсць цэлы комплекс тых жа гармонаў, якія неабходна даследаваць. Няма сэнсу іх пералічваць, паколькі гэты комплекс вядомы любому гінеколагу. Звярніцеся, калі ласка, зноў да вашага акушэра-гінеколага або гінеколага-эндакрынолага і абмяркуйце з ім больш шырокі спектр абследавання, якое мае на ўвазе абследаванне шлюбнай пары.

— Ультрагук паказаў парааварыяльную кісту яечніка. Рыхтуюць да аперацыі. Сказалі, што неабходна рабіць калонаскапію з біяпсіяй, фібрагастрадуадэнаскапію і кульдацэнтэз. Аперацыю неабходна зрабіць як мага хутчэй (трэба ехаць за мяжу), а вынікаў аналізаў чакаць 10 дзён (калонаскапіі) і 3 тыдні (кульдацэнтэзу). Ці можна зрабіць кульдацэнтэз, не чакаючы вынікаў калонаскапіі і ФГДС? І для чаго патрэбны апошнія? Яшчэ мне далі накіраванні на аналіз крыві на сіфіліс, біяхімію і анкамаркёр. А яны патрэбны для аперацыі ці для кульдацэнтэзу? І які ў іх «тэрмін прыдатнасці»?

— Усё, што вам было прызначана ў якасці даабследавання, рабіць трэба. Гэта класічны пералік падрыхтоўкі да аператыўнага ўмяшання. Праўда, калонаскапія з біяпсіяй у гэты пералік абследаванняў не ўваходзіць, а прызначаецца пры наяўнасці пэўных паказанняў. Не магу завочна сказаць, чаму вам прызначылі і гэтае даследаванне. Звычайна гэта тлумачыцца падазрэннем на анкалогію. Усе астатняе сапраўды вам трэба зрабіць.

— Летась на тэрміне 9 тыдняў быў выкідыш. Чатыры месяцы піла супрацьзачаткавы прэпарат жанін. Потым тры месяцы былі месячныя. У маі-чэрвені іх не было. Цяжарнасці не было. Я падумала, што панервавалася... Здала пры гэтым аналіз на інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам. Выявілі мікаплазмоз. Гінеколаг прапісала цыкладынон для рэгуляцыі цыкла, а на мікаплазмоз сказала не звяртаць увагі. У ліпені я пачала планаваць цяжарнасць. Што можна параіць у маёй сітуацыі?

— Я параіла б вам пакуль не спяшацца. Адсутнасць месячных пасля жаніна — не вельмі добра. Цыкладынон добры прэпарат для рэгуляцыі цыкла, аднак вам трэба, па-першае, зрабіць перапынак паміж выкідышам і наступнай цяжарнасцю, а па-другое, звярнуць увагу на мікаплазмоз. Яго трэба абавязкова пралячыць. Невыношванне цяжарнасці з'яўляецца паказаннем да лячэння мікаплазмозу. Неабходна зноў звярнуцца да ўрача-гінеколага — да таго, у якога назіраецеся, ці да спецыяліста па лячэнні невыношвання цяжарнасці або планавання сям'і.

— Вольга. 29 гадоў. Цяжарнасць першая. 23 тыдні. На ўльтрагуку ў 12 і 20 тыдняў — усё добра. Аднак здала аналіз на ўрэаплазмоз. Вынік 10 у 4-й ступені. Ці трэба лячыць гэтую інфекцыю антыбіётыкамі і ці не нанясуць яны шкоды дзіцяці? Парайце, калі ласка, гінеколага, які спецыялізуецца на лячэнні ўрэаплазмозу ў час цяжарнасці.

— Абсалютна ўсе ўрачы-гінеколагі ведаюць, як лячыць інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, у тым ліку ўрэаплазмоз. Вам трэба звярнуцца да таго спецыяліста, у якога вы назіраецеся, і пачаць лячэнне, якое ён прызначыць, бо шкода ад адсутнасці лячэння можа быць большай...

— Падкажыце, калі ласка, ці можна зацяжарыць не толькі ў час авуляцыі, але і ў іншыя дні? Як вылічыць авуляцыю пры нестабільным менструальным цыкле — 29—40 дзён? Ці можна разлічыць пол дзіцяці?

— Зацяжарыць можна толькі ў перыяд авуляцыі, гэта значыць, на працягу некалькіх дзён да і пасля яе (у яйцаклеткі і сперматазоідаў розны час жыццядзейнасці). Нават пры нестабільным цыкле можна высветліць наступленне авуляцыі з дапамогай такога простага метаду, як вымярэнне базальнай

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

тэмпературы. Павышэнне базальнай тэмпературы звыш 37 градусаў указвае на надыход другой фазы цыкла, авуляцыя наступіла. У аптэчнай сетцы прадаюцца і спецыяльныя тэсты. Праводзяць з такой мэтай і неаднаразовае ўльтрагукавое даследаванне. Што да полу, то, безумоўна, навуковых даных па планаванні полу няма.

— Іна. 25 гадоў. У сярэдзіне студзеня гінеколаг сказала, што ў мяне кісты абодвух яечнікаў і яны не знікнуць. Напрыканцы студзеня надышла цяжарнасць. На ўльтрагуку сказалі, што на абодвух яечніках — эндаметрыёзныя кісты памерам 5 і 7 см. Гінеколаг прапісала дзюфастон і іншыя прэпараты, якія прымаюць цяжарныя. На 6-м тыдні трапіла ў бальніцу з кровацячэннем з-за таго, што цяжарнасць перастала развівацца. Зрабілі выскрабанне. Праз месяц ультрагук паказаў кісты тых жа памераў. Здала аналіз, у тым ліку і анкамаркёр. Усе аналізы ў норме. Урач сказаў, што магчымая паласная аперацыя па выдаленні кіст.

Яшчэ ёсць праблемы са шчытападобнай залозай — невялікая кіста і вузел. Можа быць, існуе сувязь паміж гэтымі паталогіямі? Перанесла захворванні: запаленчыя, малочніцу, хламідыёз, мікаплазмоз, урэаплазмоз. Быў разрыў аднаго яечніка, але яго захавалі. На ўльтрагуку сказалі, што на адным яечніку не відаць здаровай тканкі. Аперацыі чакаць 2 месяцы... Я вельмі хачу дзяцей... Дапамажыце, калі ласка, у маёй праблеме...

— Эндаметрыёзныя кісты ніколі не знікаюць і не рассмоктваюцца. Яны ў 100 працэнтах выпадкаў павінны выдаляцца хірургічным шляхам, а часам па паказаннях у комплексе з гарманальным лячэннем. Вам сапраўды неабходна рыхтавацца да аперацыі. Адсюль і папярэдняе прызначэнне на анкамаркёр. Вельмі добра, што аналіз у норме. Я лічу, што можна выканаць і лапараскапічную аперацыю. Іншая рэч, калі падчас такога ўмяшання будзе выяўлена больш сур'ёзная паталогія, то хірург зможа перайсці на выкананне лапаратамічнай аперацыі. Пасля правядзення хірургічнага ўмяшання паказана кансерватыўнае, гарманальнае лячэнне. Гэта неабходна для папярэджвання далейшага росту эндаметрыёзу. Да таго ж, у маладым узросце не выконваецца максімальнае выдаленне яечнікаў. Выдаляецца мінімум здаровай тканкі менавіта для захавання магчымасці надыходу здаровай цяжарнасці.

Спачатку рэпрадуктыўнае здароўе варта абмяркоўваць з дзіцячым, пасля падлеткавым урачом-гінеколагам паліклінікі або цэнтра дружалюбных адносін да падлеткаў, а пасля 18 гадоў — з акушэрам-гінеколагам жаночай кансультацыі па месцы жыхарства. У межах жаночых кансультацый працуюць і кабінеты анкапрафілактыкі, якія займаюцца паталогіяй шыйкі маткі.

Што да эндакрыннай паталогіі, то тут трэба паказацца ўрачу-эндакрынолагу, паколькі сувязь паміж дзвюма паталогіямі сапраўды ёсць. Пасля правядзення лячэння і адной паталогіі, і другой можна будзе весці размову аб планаванні цяжарнасці.

— Мне 25 гадоў. Здавала аналіз на наяўнасць антыцелаў да таксаплазмы IgG — 530,9 рэактыўны, IgM — 3,70 рэактыўны. Паўторны аналіз: IgG — 221 рэактыўны, IgM — 1,45 рэактыўны. Падкажыце, калі ласка, ці патрабуецца спецыяльнае медыкаментознае лячэнне таксаплазмы пры такіх выніках, калі часта сустракаецца інфармацыя аб тым, што таксаплазмоз лячыць не абавязкова (абавязкова — дзецям і цяжарным). Праўда, мы з мужам плануем цяжарнасць, з-за чаго і здавалі аналізы. Дома жыве кошка, праверылі: яна не хварэе. Сама я даволі часта прастуджаюся, пры гэтым прастуду пераношу на нагах. Ці можа гэта неяк паўплываць на вынік гэтага аналізу?

— Мяркуючы па ўсім, у вас заканчваецца востры перыяд працякання таксаплазмозу і адбываецца яго пераход у хранічную форму. Вам адназначна неабходна кансультацыя ўрача-інфекцыяніста, які павінен вырашыць пытанне вашага лячэння. Каб трапіць да такога спецыяліста, неабходна спачатку наведаць тэрапеўта па месцы жыхарства. Дарэчы, з тэрапеўтам варта абмеркаваць і пытанне ўмацавання вашага імунітэту. Гэтым абавязкова трэба заняцца да пачатку планавання цяжарнасці.

— Уля, 27 гадоў. У мяне гады два двухпалімерная кіста левага яечніка 4,6х2,5 см. Тры месяцы піла дзюфастон. Узровень эстрыёлу павысіўся да нормы, але кіста не знікла. Пасля прызначылі дэтралакс, нейравітан, мецілурацыл, дыклаберл. Не дапамагло. Цяпер прызначылі — біястрэпта, цыкладынон, апаніл, ліванорм... Варта прымаць гэтыя гармоны? Або лепш ісці на аперацыю?

— Па той інфармацыі, якую вы пакінулі, я магу сказаць толькі адно: вам патрабуецца даабследаванне. Не зусім зразумела, пра якія кісты ідзе размова. Не выключана, што пасля можа спатрэбіцца і аператыўнае лячэнне. Сапраўды, ёсць кісты, якія могуць рассмоктвацца і знікаць. А ёсць такія, што падлягаюць толькі аператыўнаму лячэнню. Магчыма, вам трэба абследавацца і ў эндакрынолага.

— Мне 35 гадоў. Чацвёртая цяжарнасць, роды трэція (пасля першага дзіцяці была цяжарнасць, якая перастала развівацца на 10-м тыдні). Група крыві 1-я адмоўная, у мужа 2-я станоўчая. Двое дзяцей — з 1-й станоўчай. Пасля нараджэння першага калолі імунаглабулін. Пасля другой цяжарнасці, якая спынілася, нічога не калолі, а пасля другога дзіцяці дакладна не памятаю. Падчас родаў другога дзіцяці дрэнна раскрылася шыйка маткі (дэфармавалася пры першых родах), было кровацячэнне. Ці можна ў маім выпадку рабіць кесарава сячэнне і пасля перавязаць трубы?

— Дрэннае раскрыццё шыйкі падчас папярэдніх родаў не з'яўляецца паказаннем да кесарава сячэння. Ёсць абсалютныя і адносныя паказанні да яго. Гэта пытанне павінен вызначыць спецыяліст напрыканцы цяжарнасці. Скажам, пры высокай ступені міяпіі са зменамі на вочным дне праводзіцца планавая аперацыя кесарава сячэння. Сама жанчына не вызначае гэтую неабходнасць. Што да перавязкі матачных труб, то тут якраз дастаткова вашай згоды на гэта.

— У маёй дзяўчыны выявілі малочніцу. Гінеколаг кажа, што партнёр з мэтай прафілактыкі таксама павінен пралячыцца флуканазолам. І так трэба будзе рабіць заўсёды пры паўторных праявах. Аднак мяне нічога не непакоіць. Чаму я павінен лячыцца, калі ў мяне няма ніякіх сімптомаў? Падкажыце, якія аналізы я магу здаць? Да якога спецыяліста можна звярнуцца, каб нам патлумачылі, як павінны паводзіць сябе партнёры пры з'яўленні сімптомаў малочніцы ў аднаго з іх?

— Малочніца — гэта кандыдоз похвы. Можа з'яўляцца з-за збояў у рабоце імунітэту, розных захворванняў, цяжарнасці. Хоць узбуджальнікі малочніцы і могуць перадавацца палавым шляхам, у большасці выпадкаў яна не звязана з палавым кантактам і не адносіцца да венерычных захворванняў. У мужчыны, сапраўды, можа не назірацца ніякіх непрыемных сімптомаў. Гінеколаг цалкам мае права прызначыць лячэнне абодвум партнёрам пры выяўленні падобнай праблемы ў жанчыны і пры наяўнасці клінічных праяў у партнёра. Аднак у ідэале лепш за ўсё абследавацца абаім. Таму вам неабходна звярнуцца да ўрача-ўролага. Можа быць, у вас выявіцца яшчэ якая-небудзь схаваная інфекцыя з ліку тых, што перадаюцца палавым шляхам. У такім выпадку ваша партнёрка будзе дарэмна лячыцца, бо вы зноў інфіцыруеце яе. На час лячэння неабходна засцерагацца з дапамогай прэзерватыва або наогул устрымацца ад палавых кантактаў.

— Юлія. 26 гадоў. З 14 гадоў, як пачалася першая менструацыя, былі збоі ў цыкле. Менструацыі магло не быць некалькі месяцаў. Урачы запэўнівалі, што нічога страшнага няма: маўляў, народзіш — і ўсё наладзіцца. У картачцы пазначылі дысфункцыю яечнікаў, але лячэння ніякага не прызначалася. На ўльтрагуку ўсё ў норме. Нейкім цудам з такім цыклам мне ўдалося зацяжарыць і нарадзіць (кесарава сячэнне). Амаль год было грудное кармленне. Месячныя былі адзін раз, калі дзіцяці быў 1 год і 2 месяцы. Пасля гэтага два месяцы былі выдзяленні, аднак менструацыя не надышла. Гінеколаг сказала, што ўсё нармальна, цыкл аднаўляецца. Я перажываю, што гэта нармальна. Парайце калі ласка, што мне рабіць?

— У вас сапраўды ёсць парушэнне менструальнага цыклу. Вельмі добра, што пры такім парушэнні ўсё ж такі надышла цяжарнасць. Так, не заўсёды пры рэдкіх менструальных цыклах выяўляюцца змяненні на ўльтрагуку... Варта мець на ўвазе, што звычайна пасляродавы перыяд аднаўлення, калі менструацыя не надыходзіць, не перавышае 6-8 тыдняў. Жанчыны, якія працягла прытрымліваюцца выключна грудного кармлення, могуць сутыкнуцца з лактагеннай аменарэяй, калі месячныя не надыходзяць. Аднак у вас цыкл не аднаўляецца працяглы час. Мяркую, трэба атрымаць кансультацыю гінеколага-эндакрынолага (напрыклад, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця» або ў радзільны доме №2), бо з узростам сітуацыя можа пагаршацца...

— 35 гадоў. Падчас цяжарнасці на твары з'явілася «маска цяжарнай» — цёмныя лініі на скронях, пад вачамі, губой... Год карміла дзіця, але нічога не праходзіла. Аптэчная касметыка ад пігментацыі таксама не дапамагала. Прайшло 2 гады, рабіла 4 сеансы лазера. Плямы крыху пасвятлелі, аднак, як толькі прыйшла вясна, зноў пацямнелі. Што рабіць?

— Гэта праблема выключна касметалагічная. Вы павінны разумець, што яна абумоўлена генетычнай асаблівасцю вашай скуры. Вы можаце звярнуцца да касметолагу, якія ёсць і ў дзяржаўным Цэнтры пластычнай хірургіі і касметалогіі, і ў іншых камерцыйных структурах падобнага кшталту. Праблема носіць спадчынны характар, таму нельга вас запэўніць, што існуе нейкі спосаб абсалютнага пазбаўлення ад яе.

— Мне 20 гадоў. Аналіз ПЦР паказаў наяўнасць папіломавіруса (16-ы тып) і ўрэаплазмаў. У партнёра — толькі папіломавірус 16-га тыпу. Гінеколаг прызначыла вібрамецын і змазала кандыломы солкавагінам. Выкарыстоўвала вагінальныя свечкі поліжынакс. Курс таблетак пілі абое. Цяпер чакаем 30 дзён для здачы аналізу на пасеў урэаплазмы. Папіломавірус не лячылі, паколькі ўрач сказала, што не варта змешваць два лячэнні. Мы начыталіся рознай інфармацыі адносна нашых захворванняў. І многае не супадае. Падкажыце, ці можна планаваць цяжарнасць пры такім вірусе? Ці можна займацца аральным сексам пры ўрэаплазме? Ці можна займацца сексам без прэзерватыва да лячэння папіломавіруса, калі ён ёсць у абаіх? І ці можна займацца сексам без прэзерватыва незалежна ад лячэння? Ці трэба лячыць папіломавірус, калі няма ніякіх клінічных праяў?

— Папіломавірус небяспечны тым, што шэраг яго тыпаў — і гэта даказаны факт — могуць выклікаць рак шыйкі маткі ў жанчын і рак палавога члена ў мужчын. Менавіта таму ў шэрагу краін, у тым ліку і ў нашай, яшчэ да пачатку палавога жыцця, ва ўзросце 12-14 гадоў, прапануецца вакцынаваць дзяўчынак ад віруса папіломы чалавека. У нашай краіне такая вакцынацыя праводзіцца на платнай аснове. Такім чынам, вы разумееце, што гэта не жартоўная інфекцыя і нельга пакідаць яе наогул без лячэння. Цалкам вірус папіломы чалавека выдаліць з арганізма не ўдасца, аднак, як і ў выпадку з герпеснай інфекцыяй, лячэнне дапамагае дасягнуць нізкага ўзроўню актыўнасці віруса. Таму лячэнне павінна быць абавязковым у абаіх партнёраў. На час лячэння любой інфекцыі, якая перадаецца палавым шляхам (а вірус папіломы чалавека і ўрэаплазмоз, як вядома, адносяцца да іх ліку) абавязкова трэба засцерагацца з дапамогай прэзерватыва. Толькі пасля правядзення лячэння, умацавання імунітэту можна будзе планаваць цяжарнасць.

— Мне 30 гадоў. Цяжарнасцяў і родаў не было. Менструальны цыкл рэгулярны. Спадарожных захворванняў няма. Цягам апошніх трох гадоў прымала лагест. Рэгулярна, раз у год, наведваю гінеколага. Апошнія тры месяцы піла джэс. Пасля 1-й і 2-й упакоўкі — месячныя, на 4-ы дзень плацэба, нямоцныя, але працяглыя, каля 5 дзён. Выпіла 3-ю ўпакоўку (усе актыўныя і 3 плацэба). Пачала 4-ты пачак, але месячных так і не было. Ужо выпіла 2 актыўныя таблеткі. Падчас прыёму 3-й упакоўкі пропускаў не было, заўсёды прымала ў адзін і той жа час. Што гэта можа быць? Што рабіць далей?

— Ёсць два варыянты. Гэта можа быць проста невялікі збой, а можа быць, з'явіліся і нейкія парушэнні. Варта зноў звярнуцца да свайго ўрача-гінеколага і адмяніць прэпарат — зрабіць перапынак.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Каля 15 працэнтаў пар ставяцца на ўлік з дыягназам бясплоднасць. Нярэдка ў жанчын выяўляецца адразу некалькі захворванняў, якія яе абумовілі. Прычыны? Інфекцыі, што перадаюцца палавым шляхам, эндакрынныя парушэнні (гарманальныя, звязаныя з выспяваннем яйцаклеткі, немагчымасцю прыжывання плоднага яйка ў матцы), імуналагічны фактар або несумяшчальнасць партнёраў, калі ў жанчыны выяўляюць антыспермальныя антыцелы.

■ Нататкі адпускніка

ВОДПУСК — ГЭТА МАЛЕНЬКАЕ ЖЫЦЦЁ...

Галоўная радасць і задавальненне — лета вярнулася! Зноў загулі побач рухавікі камбайнаў... Праз дрэвы, калі стаіш на ганку, можна ўбачыць іх грувасткія «целы» на дарозе, калі яны едуць праз пасёлак на чарговае поле. Зноў можна купацца! Пра тое, што купальны сезон адкрыты, відаць яшчэ на пад'ездзе да ракі: па доўгай вуліцы ідуць пехатою, едуць на веласіпедах і скутарах падлеткі, маладыя маці з дзеткамі і надзіманымі цацкамі (вядома, у сярэдзіне дня большасць дарослых яшчэ на працы). Ідуць да ракі адразу ў купальніках, так што можна і не пытацца, ці цёплая вада.

...Цікава нетаропка праехацца па вуліцах на веласіпедзе, разглядаючы, дзе, што і як змянілася за апошні час. Напрыклад, кінулася ў вочы, што зараз на змену папулярным яшчэ нядаўна бетонным агароджам (драўляныя ставяць усё радзей) прыйшлі металічныя: бардовыя, сінія, зялёныя, высокія і не вельмі. А яшчэ з'явілася адмысловая мода на каменныя платы. Гэта калі самі слупы вырабляюцца з адносна вялікіх камянёў, а прамежак паміж імі запаўняецца дзе дошкамі, дзе металам. Працэс працаёмкі і доўгі, але ахвотных усё больш. Памятаю, як школьнікамі збіралі тыя камяні на палетках, звозілі іх потым да краю поля і папросту ссыпалі. Цяпер на іх, кажуць, ідзе сапраўднае «паляванне». Яшчэ адзін «шык» — мець на самім участку ці ўздоўж яго з боку вуліцы аздабленне з валуноў. Відавочна, што зараз вырошчванне ўраджаю на ўласных сотках адыходзіць на другі план, саступаючы месца прыгажосці (хто як яе ўяўляе).

Яшчэ адна дэталь. Зараз практычна ў кожным другім доме з'явілася шклопакеты. Апошнія — не толькі гарантыя захаванага ў доме цяпла. Драўляныя шыбы трэба даволі часта фарбаваць, а каб фарба добра лягла, іх трэба папярэдне ачысціць ад папярэдняга слою. Працэс, мякка скажам, нудны. Ды і на зіму трэба падвойныя рамы ставіць, заклейваць іх. Па вясне — зваротны працэс. Узімку можна было для праветрывання карыстацца толькі невялікай форткай. Шклопакет — зусім іншая справа, цывілізацыя. Толькі многія ўстаўляюць іх у старыя «каробкі»: калі здымаюць ранейшыя драўляныя фарбаваныя налічнікі, а калі — не. Каб паставіць большае па памеры акно, трэба праразаць бензапілой драўляныя (як правіла) сцены дома, пашыраючы праём. Далёка не кожная фірма па ўстаноўцы пластыкавых вокнаў возмецца за такую працу. Мы з братам летась самі яе выконвалі. Уяўляеце, што робіцца ў доме?.. Таму большасць ідзе па шляху найменшага супраціўлення. У выніку я «байніцы» ў старых вясковых хатах, якія хаваюцца за старымі паўразбуранамі платамі. Выглядае, шчыра кажучы, некалькі дзіўнавата...

«Калі заехаць на ўзгорак, здаецца, што да самага гарызонту на адным полі, на другім у чаканні загаду стаяць арміі цёмна-залацістых саламяных воінаў...»

Дарэчы, пра хаты. «У вас жа такое вялікае паселішча, а ты сказаў — у вёску еду?!». Гэта былі першыя словы сяброўкі, што завітала з горада да нас у госці. Інэса — наша калега. У Пекіне яна пражыла 12 гадоў, зараз пераехала ў Чэхію, будзе ўжо ўласным карэспандэнтам у Цэнтральнай Еўропе... Самае дзіўнае, што ў горадзе з-за спраў (нават у водпуску) сустрэцца ў нас не атрымалася, таму вырашылі сустрэцца за горадам, на прыродзе. З Інэсай, як некалі высветлілася, у нас вялікае кола агульных знаёмых, але, як ні дзіўна гэта прагучыць, мы пазнаёміліся (даўно тое было) за мяжой. З таго часу сябруем і сем'ямі, і дамамі. У прамым сэнсе: у нас практычна адначасова з'явілася ўласнае жыллё і мы нават разам ездзілі на будаўнічыя рынкі выбіраць матэрыялы, раілі нешта адно аднаму.

...Што можа быць лепш, чым у спякотны дзень пасядзець у цяньку пад алычой-шатром у добрай кампаніі? Правільна, паласавацца засмажаным шашлыком! Ну, і каб да яго ў келіхах што было, акрамя хатняга кампоціку са свежых ягад... А калі сонца садзіцца, зноў распаліць вогнішча, каб, седзячы ў шэзлонгах, папросту глядзець у цемры на агонь, прыгадваць мінулае і дзяліцца планамі на будучыню... Ранкам жа, калі праспявалі пеўні і стала зразумелым, што будзе спёка, зноў уладкавацца пад алычой, каб паснедаць у прахалодцы... Шкада толькі, што не змаглі нашай госці дагадзіць з сувенірамі. Што нашаму чалавеку за мяжой можа лепш нагадаць пра радзіму, як не беларускія валёнкі, ці не так?! Але, на жаль, менавіта ў той дзень крама пры валяльна-лямцавай фабрыцы чамусьці не працавала...

Але ў водпуску былі не толькі радасныя моманты. Неяк патэлефанавала сваячка з дрэннай навіной: на пасялковых могілках невядомыя вандалы пабілі процьму помнікаў. Кінуў усе справы, пабег правяраць, ці ўсё ў парадку з магіламі нашых сваякоў. Пакуль дайшоў, сустрэў аднакласніцу, потым таварыша. Пацвердзілі: праўда, пабілі ці то 50, ці то 80 помнікаў. Прычым, высветлілася, што ўжо не ў першы раз... На магілах нашых сваякоў помнікі ніхто не крануў, дзякаваць Богу. Пакуль дайшоў, сапраўды бачыў некалькі паваленых помнікаў. Каб гэта зрабіць, патрэбны былі намаганні, напэўна, не аднаго чалавека. Калі тых, хто тое нарабіў, увогуле можна называць людзьмі...

Падчас водпуску мы заўсёды імкнёмся знайсці дзень, каб наведаць магілы родных і прыбрацца там. На жаль, за год такіх магчымасцяў нашмат... Дзед па лініі маці нарадзіўся ў 1862 годзе. Памёр у 1954-м. У яго было тры жонкі, трынаццаць дзяцей, таму ў нашай радні ўсё так заблытана... Старэйшыя дзеці загінулі падчас Вялікай Айчыннай. Мы ведаем іх толькі па імёнах. Апошняй жонкай у дзеда была наша бабуля, якая нарадзілася ў 1901 годзе. У іх нарадзілася пяцёра дачок. Яна памерла ў 1986-м, а пахаванне было ў дзень, калі мяне прымалі ў райцэнтры ў камсамол. Адразу з аўтобуса ад шашы я збочыў на могілкі, паспеў на пахаванне... Мая жонка кожны раз, калі прыходзіць на могілкі, пачынае падлічваць, колькі ж гадоў было майму дзеду, калі ў яго нарадзілася самая малодшая з дачок — мая маці. Атрымліваецца, што 78! «Вось дык мужчынская сіла», — смяецца жонка... Спачываюць тут і іншыя родныя: цёткі, дзядзькі, гумарны стрыечны брат Юрка, што пайшоў зусім маладым... Некалі ён вазіў мне са сталіцы рыбалоўныя кручкі і лёску

«Алыча гулка падае на стол, можа бразнуцца аб талерку ці нават патрапіць у напоўнены кубак... Гэта азначае, што хутка пара збірацца ў горад...»

з грузіламі, браў з сабой на рыбалку і ў грыбы... Некаторым пахаванням не адзін дзясятак гадоў, некаторыя — зусім нядаўнія...

Калі хочацца ў лес, у нас ёсць выбар — у бліжні ці дальні, як мы іх называем. Не ў грыбы-ягады. Проста праехацца на веласіпедах, пажыць у цішы. Летась быў шок ад наведвання дальняга лесу... Калі ўязджаеш у яго, высачэзныя дрэвы высяцца абапал дарогі, дорачы выратавальны цень.

Так было заўсёды, колькі я сябе памятаю. А тут заехалі, а з левага боку — правал, «дзірка»... Старыя дрэвы спілавалі, пасадзілі маладняк. Усё правільна, напэўна, так і трэба. Толькі вось адчуванне, што пазбавілі цябе нечага дарагога, важнага... І лес як быццам ужо не той...

Камбайны амаль прыбралі збажыну, засталася невялікая лапінка. Па полі бегаюць два трактары, такія маленькія, як цацачныя здалёк, прасуюць у вялікія круглыя цюкі салому. Калі заехаць на ўзгорак, здаецца, што да самага гарызонту на адным полі, на другім у чаканні загаду стаяць арміі цёмна-залацістых саламяных воінаў... З іншага боку дарогі сёлета кукурузу пасадзілі ўшчыльную да самай праезнай часткі. Яна вымахала метры на два, стаіць суцэльнай зялёнай сцяной, ствараючы незвычайнае ўражанне, нібы гэта нейкія джунглі. Калі хутка едзеш на веласіпедзе, а свежы ветрык калыша побач вялікія расліны, здаецца, што нехта нябачны бяжыць у высокай кукурузе паралельна з табой навыперадкі...

Неяк мне патрапіў на вочы артыкул пра інавазійныя расліны, што некалі па розных прычынах аказаліся ў нас і зараз літаральна выцясняюць абарыгенаў, не пакідаючы ім шанцаў. Змагацца з імі вельмі цяжка, а сама пагроза набывае ўсё большы размах. Пра баршчэўнік Сасноўскага ведаў і дагэтуль: уздоўж ракі яго месцамі балшчы, усе ведаюць?.. Прыгожыя здалёк жоўтыя палі залатарніку літаральна прымыкаюць да палёў са збажыной. Граніца — як пад лінейку: там, дзе ўжо прайшоў камбайн... Так званы «шалёны агурок» таксама надзейна прапісаўся шмат дзе і нагадвае пра сябе сваім спецыфічным пахам. Не думаю, што гэта праблема адной толькі канкрэтнай мясцовасці, проста па ёй, напэўна, можна меркаваць пра агульны маштаб патэнцыяльнай бяды.

«Прыгожыя здалёк жоўтыя палі залатарніку літаральна прымыкаюць да палёў са збажыной. Граніца — як пад лінейку: там, дзе ўжо прайшоў камбайн...»

...Пра тое, што водпуск набліжаецца да свайго лагічнага завяршэння (вой, маўчыце, не гаварыце ўслых лішні раз!), нагадвае наша любімая алыча. Яна ў нас расце не зусім па правілах. У тым сэнсе, што абразаем мы яе не дзеля атрымання вялікага ўраджаю, а так, каб пад ёй было зручна сядзець, хаваючыся або ад спёкі, або ад невялікага дажджу. Калі плады пачынаюць падаць, калі перад тым, як сесці за вялікі і шырокі стол пад ёй, трэба спачатку расчысціць сабе дарогу, значыць, час адпачынку няўмольна заканчваецца. Алыча гулка падае на стол, можа стукнуцца аб талерку ці нават патрапіць у напоўнены кубак... Гэта азначае, што хутка пара збірацца ў горад... Пра тое ж сведчаць і клумбы, зробленыя рукамі жонкі: калі на іх нарэшце ўсё распусцілася, радуе вока, значыць, наша лета ўжо скончана... Калі перафразіраваць словы песні вядомага барда, водпуск — гэта маленькае жыццё. У якім ёсць і вясёлае і сумнае, якое напоўнена працай і адпачынкам, сонцам і дажджамі, сустрэчамі і развітаннямі. Усё як у звычайным жыцці, толькі за невялікі тэрмін. І на сёлетні год ён ужо фактычна пражыты... «Чаму не на моры?» За водпуск ад розных людзей я чуў гэтую фразу не адзін раз... А таму, што мне вельмі добра там, дзе я нарадзіўся...

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота аўтара
■

■ Факт

Атрымаць зарплату дапамог пракурор

Толькі пасля звароту ў пракуратуру жыхар Полацкага раёна атрымаў заробак пасля звальнення.

— Па факце нявыплаты заработнай платы ва ўстаноўленыя тэрміны і затрымкі разліку пры звальненні работніка пракуратурай Полацкага раёна ў дачыненні да адной з фірмаў быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні. Пратакол накіравалі для разгляду ў суд. У выніку на юрыдычную асобу накладзена адміністрацыйнае спагнанне з выплатай 2,5 мільёна рублёў, — паведаміла Святлана Зайцава, намеснік начальніка арганізацыйна-кантрольнага аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці.

Грамадзяне нярэдка звяртаюцца ў органы пракуратуры са зваротамі па пытаннях нагляду за выкананнем адміністрацыйнага, працоўнага заканадаўства, заканадаўства аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб. І найбольш часта прызнаваліся абгрунтаванымі довады грамадзян аб затрымцы разліку пры звальненні, неабгрунтаваных вылікаў з заработнай платы, аб яе нявыплаце. Пракурорамі праводзіліся праверкі і прымаліся меры рэагавання.

У цэлым сёлета толькі ў першым паўгоддзі ў органы пракуратуры вобласці паступіла звыш 4,6 тысячы пісьмовых зваротаў. На асабістым прыёме пабывала больш як 2,8 тысячы чалавек, з іх 441 — па месцы жыхарства і працы. Паранейшаму значная колькасць зваротаў не ўваходзіць у кампетэнцыю пракуратуры і для разгляду накіравана ў іншыя ведамствы.

Актыўна выкарыстоўвае насельніцтва і электронную пошту. За паўгоддзе ў пракуратуру вобласці паступіла 60 такіх заяў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ
■

■ Хто каго?

«...НЕ ПАДЗЕЛЯЦЬ БАБЫ МУЖА А ТЫМ БОЛЬШ — ВЕЛАСІПЕД!»

Што было — было. Праўда, досыць даўно, бо зараз дзяўчат не сватаюць. А вось тады...
Значыць, сабраліся тыя сваты, прыехалі, зайшлі да дзеўкі ў хату, як і належыць, адразу ж заявілі, што ў вас, маўляў, тавар, а ў нас купец... Ды яшчэ і які — не курыць, не п'е, да дзевак не бегае... «Сваточкі, — злазячы з печы, насцярожылася бабуля нявесты, — а ён у вас часам не дурань?»
Аднак гэта — не адзіная выснова, якую можна было зрабіць. «Ойча, мне здаецца, я правільна жыву? — спытаў адзін вернік на споведзі. — Не п'ю, не куру, не гуляю, ды што там — на жанок нават не гляджу. У дзесяць вечара кладуся спаць, кожную нядзелю хаджу на месу...» Перапыніў яго бацюшка. Цяжка ўздыхнуўшы, сказаў: «Баюся, сын мой, што гэта — у цябе ненадоўга, што як толькі ты выйдзеш з турмы, усё зменіцца».

Здымак (верхні), кажаце, не пра такога мужчыну? Ды як паглядзець... Тым больш што «гледачоў» у нас — не злічыць... І кожны бачыць сваё. А потым, здараецца, піша. Вось такія радкі — спадар Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна:

Не расказваў Янка маме
І ад таты утаіў:
Станіславу нейк на раме
За ваколіцу вазіў.
І, наехаўшы на ямку,
Маху даў не слаба ён:
Стаў мужчынскі
ровар «дамкай»,
Ну а дзеўка — бабаю.

Трэба разумець, жонкай?.. І зараз, праз гады, седзячы на раме, на думку спадара Сцяпана Нефідовіча з вёскі Любань Лунінецкага раёна) на ўвесь свет выхваляецца:

Расшукала сабе мужа я,
Што няма дабрэй на свеце!
На руках насіць не здужае —
Дык вязе на «лісапедзе»!

Што ж — яно і сапраўды здараецца — шанцуе асобным:

Не едзе жанчына —
Ў нябёсах лунае:
Багаты мужчына
Старым не бывае!

Сцвярджае гэта спадарыня Ала Тарасік з Мінска. Яна ж неяк нясмела дадае: «Каханы, кажуць, таксама?»

Шкада вось — знайсці іх складана! Але ж, як высвятляецца, можна. Спадар Юрый Вінаградаў з Бабруйска ад імя мужчыны са здымка (кіньце вочкам) піша:

Я каханую сваю,
Хоць на ровары катаю.
Бо на «хондзе» — не магу:
Не так многа зарабляю.

Іншая кабета, магчыма, мела б да мужа прэтэнзіі , «пілавала» яго, гэта — ні ў якім разе, бо разумная. Адкуль вядома? Ды той жа спадар Вінаградаў дыялог запісаў, а значыць, даў магчымасць паслухаць, што, прабачце, нейкі дурань кажа кабеце і што яна адказвае яму:

— Гэй, на раме, до свяціцца,
До сабою ганарыцца:
Просты ж «велік» —
не машына...
— Ты глядзі, які мужчына!

Менавіта на яго, што цалкам лагічна, скіраваны позірк і спадарыні Любові Чыгрынавай з вёскі Забалацце Вілейскага раёна:

О, Валодзька? Зух дык зух:
Ён ля баб «не ловіць мух».
Як пачне шаптаць
«пра гэта»,
Млее кожная кабета.
А калі ж ад слоў
да справы —
То... заняты, то... кульгавы...

І, што крыўдна, не лечыцца.

Чаму? Ды, кажуць, спачатку хацеў: неяк прычыкіляў да доктара, паказаў нагу, папрасіў: «Можа, вы мне вывіх управіце?» Той адразу ж: «Я вам скажу, колькі гэта будзе каштаваць... А вы ўжо потым глядзіце, упраўляць тую нагу ці так пакінуць».

Вось ён і выбраў — вырашыў, што сцерпіцца, потым. Але ж спачатку і сапраўды — не да любошчаў. Да таго ж і пра наступствы грэх не думаць, як лічыць спадарыня Чыгрынава:

Не шапчы, мужык,
«пра гэта» —
Разахвоціцца кабета...
А прачуюць жонка, мамка,
Будзе дома прачуханка.

Ды каб толькі яна, дома, а то ж і «на баку» без гэтага ну ніяк (на думку спадара Гарачова з Іўеўшчыны):

Мець каханку — то задужа,
Бо не выйдзе ўсё як след:
Не падзеляць бабы мужа
А тым больш — веласіпед!..

(Што ўжо казаць пра бізнес, кватэру, машыну, дачу...). І сапраўды — якая-ніякая, але ж тэхніка, яна адны рукі любіць. І таму:

Як той певень ля жанок
Янка выступае,
У нядзельку па чарзе
Кожную катае.

Піша так спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў. Ён жа, паўглядаўшыся ў здымак, задаўся пытаннем: а чаму той Янка адзін, дзе ж іншыя? А потым сам і адказаў:

Па статыстыцы, мужчыны
Менш на дзесяць год
жывуць.
Кажаце, што ёсць прычыны?
Ёсць.
Галоўная — жанчыны
Мужыкоў не берагуць.

А потым (крый Божа, страціўшы...) заліваюцца слязамі, плачуць... Адна вось такая — дык нават з прыгаворам: калі ён памёр, дык і я, маўляў, жыць не хачу — пайду за ім! Людзі спынілі, сказалі: «Бабачка, пабойся Бога! Дай ты яму спакою — ну хоць бы ў труне!»...

А ўсё чаму? Сужэнцы Астроўскія з Мінска лічаць так:

Як нідзе і як ніколі
Нашы жонкі маюць волі:
Пагалоўна мужыкі
Нібы тыя прымакі.

З усімі адсюль наступствамі... Пра якія піша спадар Сцяпан Нефідовіч з Лунінеччыны:

У народзе кажуць часам:
Раз прымак,
то пад абцасам —
Ён у будні і ў святы
Усё заняты і заняты...
Вось і тут: вязі Адарку,
Што за шчасце —
не на карку.

А сесці на яго (як лічыць спадар Гарачоў) яна магла б:

Колы круцяцца паволі
Рамы гнуцца, мабыць:
Не давайце бабам волі,
Бо й на шыю сядуць!

...Але ж гэта далёка не ўсё, што ўбачылі нашы чытачы: хто за што вокам зачапіўся. Вось спадар Вінаградаў:

Вязе дзядзька маладзіцу
У прыгожае спадніцы.
Папрасіў яе рукі:
Не, не дурні мужыкі!

Вось Марыя Грышчанка з Дзяржынска:

У інтэлігенцыі
Новыя тэндэнцыі:
Сваю мілую красу.
Сам да ЗАГСа давязу.

Вось спадар Кісель з Мінска:

Зімою калядку
Цягнуць на дуба,
А тут на прысвятку —
Суседку — да шлюбу.

Не жарт: пераспела
Кабета ў замужжа,
Аднак жа «на вела»
Трымаецца мужна!

(Як, дарэчы, і жаніх... Бо — на думку таго ж спадара — ну што яму яшчэ застаецца, калі...

Падабраў сабе сяброўку —
На багатых мода.
І цягнуць цяпер нялоўка,
Але й скінуць шкода).

Спадарыня ж Ларыса Салей са Скідзеля лічыць, што жанчына на веласіпедзе не адна:

Запаволіў Янка рух:
Яму цяжка везці дзвюх
У ягоныя гады...
От, каб быў ён малады!..

Не толькі ў тым, на жаль, падставы для шкадавання: «Абязлюдзела шмат нашых вёсак, асабліва малых. Для мяне гэта вельмі балючае пытанне, бо якраз у такой я вырас, — піша спадар Гаўрыш з Чавусаў. — Сярэдняй школы ў нас не было — толькі пачатковая, чатыры класы... Па дзесяць дзяцей, і тое ўжо сорак! А былі ж яшчэ і старэйшыя! І тыя, што пехам пад стол хадзілі...»

Адтуль, відаць, настальгічнае:

Усё было! Калісь было:
Дзетак — рой пчаліны...
Ды з гадамі ўсё сплыло —
Толькі ўспаміны.

Але ж гэта, скажам так, лірычнае адступленне. Хоць, магчыма, і ў тэму, працяг якой у радках спадара Мікалая Старых з Гомеля:

Мала ў вёсачцы людзей,
Да іх транспарт не ідзе...
Выручае дзядзька Грыша:
Ён працуе веларыкшам.

Вас цікавіць, ці выгадны гэта бізнес? Спадар Нефідовіч мяркуе, што так:

Аніколі не гультуе
У вёсцы дзядзька Федзя:
Ён рамізнікам працуе —
На веласіпедзе,
Па чарзе жанок катае —
Хоць за горы... Толькі сядзь.
А што з гэтага ён мае —
Самі здагадайцеся.

Бо хто ж гэта скажа па цяперашнім часе: камерцыйная тайна. Ды, можа, і нічога не мае — апроч задавальнення. А то і... аклад:

Ну не йдзе люд у клуб —
Ні ў будні, ні ў свята!
А трэба ж музыку
Апраўдваць зарплату?
Таму і збірае
Жанчынак па хатах:
Танцорачкі ёсць,
Ды пяюх — малавата.

Таму ім, пяюхам, як лічыць спадарыня Чыгрынава, і гонару больш: іх на веласіпедзе вязуць. А танцорачкі пехам чэшуць...

Куды?

Белы свет ускалыхнулі
Бабкі, што з Буранава.
Вось і гэтым заманулась:
Прагрымець бы нанава!

І могуць жа! Прынамсі — на думку спадарыні Раісы Васільевай з Гомеля:

Людцы добрыя, глядзіце
На святочны карагод,
Што праводзіць маладзіцу...
Ў Байканур і у палёт!
Там, у космасе — прастора,
Шмат ракетаў прагуло.
Але ў гэтакім уборы
Шчэ паненак не было.

Усё напарадзе, значыць, у нашых паненак! Галоўнае — верыць і «ласты не склейваць». А то знайшоўся адзін (спадар Н)... На здымак паглядзеў і выдаў:

Калі ногі не нясуць,
Дык сядзіце ў хаце:
Маладзейшых падвязуць,
А старых — наўрад ці.

І дзе ён іх толькі ўбачыў?.. Калі жанчыны самі вырашаюць, колькі ім гадоў, калі ў іх толькі тры ўзросты: дзяўчынка, дзяўчына, маладая жанчына, маладая жанчына, маладая жанчына... Такой і памрэ... Што крыўдна.

А што на радасць (і якую ж вялікую!), дык гэта, калі ў такой вось маладой (як на раме сядзіць), бацькі жывыя-здаровыя, калі з імі — заўсёды і пра ўсё — можна пагаварыць, параіцца... Каб потым (услед за спадаром Гарачовым) прызнацца:

Татулька не даў сваёй згоды,
Ды радасць
было маёй маме:
Для Мінскага велазавода
Я зноўку знялася ў рэкламе!

І не адна, між іншым, з чалавекам... Які ўсім сваім відам (паводле спадарыні Чыгрынавай) зараз гаворыць:

На халеру мне «ландровер»,
Калі маю мінскі ровар?
І зусім не мулка даме
На жалезнай тонкай раме.

Чаму не мулка? Адказаў можа быць шмат. Тут толькі адзін — ад спадара Кісяля:

Ножка на педалі,
Рукі — на рулі —
Гу́лі на Купалле...
Дзеўкі й «загулі».

А маглі яшчэ, як лічыць спадарыня Кусянкова з вёскі Лучын, што на Рагачоўшчыне, загуляць, загудзець на дажынках:

Сёння свята ў нашых хатах:
Ураджай знялі багаты
І ўся вёска так гуляла,
Што пітва забракавала.
Села крамшчыца на раму:
— Старшыня, вязі ў краму!

І вязе, як бачыце! Бо трэба ж слухаць людзей, калі хочаш, каб яны цябе слухалі. Ды і радасць жа, калі добры ўраджай, калі нарэшце свята...

То хай яно будзе і на вашых вуліцах!

Анекдот — у тэму, як той казаў. Адна кабетка дужа ж свята чакала. І такі дачакалася. Называецца яно Дзень пажылых людзей.

Не смейцеся, гэта — добрае свята, бо для тых, што ўжо пажылі... Магчыма нават — «на кані і з песнямі». «Сустрэча з кожным новым здымкам (гэта мы вяртаемся да старога. — **Аўт**.) для мяне — вялікая радасць, — піша спадарыня Васільева з Гомеля. — Яшчэ большая — ад прачытання подпісаў, якія прыдумалі іншыя чытачы, а ўжо нарэшце сапраўдная асалода ад творчасці, ад працы над сваімі радкамі. У мінулы раз (на здымку, нагадаем, чалавек з гітарай ляжаў на спіне ў каня. — **Аўт**.) вельмі спадабаліся подпісы спадароў Валерыя Гаўрыша пра тое, як жа можна — «косю мець і застацца босым», Міколы Кісяля і Сцяпана Нефідовіча пра небарак, якія даіграліся і дапіліся, спадарынь Святланы Іванец, Таццяны Баркоўскай...».

Іншыя нашы чытачы, удзельнікі конкурсу, назвалі іншых пераможцаў. Ад чаго маленькае рэдакцыйнае журы трохі разгубілася (у лепшых ці не ўсе!), потым паспрачалася (кшталту: так, у Гарачова класныя радкі, але ў пераможцах ён быў і сужэнцы Астроўскія — нядаўна былі, і Валерый Гаўрыш, і Сцяпан Нефідовіч... Хто пакуль не быў (пры амаль роўнай колькасці балаў), дык гэта **спадарыня Таццяна Баркоўская з вёскі Жажэлка Смалявіцкага раёна.**

А таму менавіта ёй прысуджана першае месца і прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету. Хочаце, каб «Звязда» цэлы квартал бясплатна прыходзіла да вас? Тады ўважліва паглядзіце на чарговы конкурсны здымак і прыдумайце подпіс — дасціпны, кароткі (не больш за восем радкоў), на беларускай мове... А раптам — пашанцуе: возьмеце ды і пераможаце? Або проста атрымаеце задавальненне ад самога «працэсу», ад удзелу ў конкурсе, бо для здароўя, як пішуць чытачы, гэта вельмі карысна!

Валянціна ДОЎНАР

P.S. *Вызначыла свайго пераможцу і рэдакцыя часопіса «Вожык». Прыз у выглядзе падпіскі на вераснёўскі нумар застаецца* ***ў Мінску — у спадара Міколы Кісяля.***

P.P.S. *Шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі на гэты раз не прайшлі строгага конкурснага адбору. Пішыце новыя!*
■

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

Наш культурны асяродак

Жыроандоля

Выпуск № 29 (199)

■ Кінакрокі

ЗАЦЯГВАЕ!

На Smartfilm'е перамог фільм пра тое, чаму небяспечна фатаграфаваць сябе ў люстэрку

Сапраўды, па пераможцах трэцяга фестывалю мабільнага кіно Smartfilm, у якім сёлета бралі ўдзел 113 рэжысёрскіх стужак, знятых на мабільныя тэлефоны, можна меркаваць пра агульныя тэндэнцыі ў маладым беларускім кіно, яго патэнцыял, перспектывы і магчымасці.

Галоўны прыз у намінацыі для прафесіяналаў «PRO» атрымаў Андрэй Ляўковіч за фільм «Люстэрка». Дасціпная лаканічная стужка — узор выдатнага пачуцця гумару, іроніі і нават сарказму, цудоўнага валодання камерай і здольнасці атрымаць максімальны вынік, карыстаючыся мінімальным наборам сродкаў. Сюжэт фільма просты. На спантаннай вечарыне ў кватэры аднаго з герояў усе ўдзельнікі захапляльнага хатняга мерапрыемства па чарзе заходзяць у ванны пакой па сваіх патрэбах і, бачачы вялікае люстэрка, вырашаюць сфатаграфавацца ў ім. Гучна іграе музыка. На яе фоне разэлаваны сусед ушчувае вясёлых маладых людзей. Зразумела, што гэта павінна «выстраліць» напрыканцы фільма. І пасля таго, як усе, хто сфоткаўся ў люстэрку, знікаюць у ім (нават два бравыя міліцыянеры, якіх выклікаў сусед), з'яўляецца сам сусед. Ён яшчэ раз пераканаўча пагражае маладым людзям: маўляў, нечага тут! І камера паказвае нам, што ўсе яны апынуліся ўнутры люстэрка... Вось як фантасмагарычна можа скончыцца такая сучасная і да болю знаёмая гісторыя пра «сфоткацца ў люстэрку».

У намінацыі для аматараў «LIGHT» перамог Юрый Капаткоў з чорна-белым нямым міні-фільмам «Cinema». Гэтая стужка, як ні дзіўна, таксама пра фота. А яшчэ пра кіно і рэальнасць. І пра тое, як фота і рэальнасць могуць уплываць на кінематограф. Увага: жарты! Гэты фільм нагадаў мне пра французска-бельгійскі фільм «Артыст», які атрымаў «Оскара» ў 2012 годзе. А значыць, маладыя беларускія рэжысёры імкнуцца за Галівудам. У прынцыпе, гэтая тэндэнцыя ўжо адзначалася. Узгадайма хаця б фільм Крыса Нонга «Здымаць на паражэнне». У Юрыя Капаткова трошку іншае імкненне: больш артавае, камернае, стылістыка мадэрну, заблытаны сюжэт.

Варта адзначыць і фільм маладога, але ўжо даволі вядомага рэжысёра і аператара Максіма Багдановіча, які атрымаў спецпрыз за фільм «Соль». Фільм зроблены ў фармаце музычнага кліпа, з дынамічным мантажом і добрым пачуццём гумару. Раніца, музыка Цоя, маладая жонка гатуе сняданак, малады муж ніяк не хоча прачынацца. Жонка ідзе на працу, не дабудзіўшыся яго. І так з дня ў дзень. Аднойчы жонка не вытрымлівае і насыпае мужу ў кубак з гарбатай соль замест цукру... Так, між іншым, у людзей жыццё мяняецца!

Дарэчы, усе фільмы-пераможцы адрозніваюцца падобнымі стылістычнымі падыходамі: буйныя планы, умоўнасць дэталяў, мінімальная колькасць акцёраў. У прынцыпе, яно і зразумела: кіно ж мабільнае! Між іншым, у свеце фестываляў, падобных на Smartfilm, існуе мноства. А ў нас вось хіба што мабільны аператар «Вэлком» (пры падтрымцы Міністэрства культуры) вырашыў, што падтрымліваць творчую актыўнасць такога кшталту, як здымкі кіно на любы гаджэт, здольны гэта зрабіць, вельмі перспектыўна: можна выхаваць абсалютна самастойную канкурэнтаздольную крэатыўную моладзь.

Выглядае на тое, што з усё большым развіццём найноўшых тэхналогій і інтэрнэту творчыя людзі становяцца ўсё менш і менш залежнымі ад так званых «абставін непераадольнай сілы». Інакш кажучы, ствараць ім больш нішто не замінае. Ну, альбо зусім нішто. Прынамсі, сёння бадай у кожнага ёсць мабільны тэлефон або фотаапарат з магчымасцю здымаць відэа прыстойнай якасці. Зняў, зрабіў увесь постпрадакшн дома на камп'ютары, «заліў» на ю-туб — і ёсць вялікая верагоднасць таго, што менавіта тваё відэа завалодае планетай. Праўда, можа быць, зусім ненадоўга. Тыдні на два, напрыклад. Але тым не менш! У любым разе паглядзім, з якім настроем вернецца з Галівуда Андрэй Ляўковіч, які за перамогу атрымаў у якасці падарунка паездку на самую буйную ў свеце кінафабрыку на адну з дзейных кінастудый.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

15 спектакляў з 8 краін

Праграма III Міжнароднага тэатральнага форуму не толькі складзена, але напрыканцы ліпеня ўжо пачаўся продаж квіткоў на паказы спектакляў.

Адпаведна, у публікі ёсць час вывучыць фестывальную афішу і вызначыцца з тым, што хочацца паглядзець. А калі выбар будзе зроблены ў бок не аднаго спектакля, то нашы тэатралы маюць магчымасць падрыхтавацца фінансава, нешта адкласці на квіткі. Час ёсць: фестываль «Тэатр» пройдзе ў Мінску з 28 верасня па 21 кастрычніка. Кошт квіткоў вельмі розны: ад 40 тысяч да 350 тысяч беларускіх рублёў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Выстава

ЧАСЦІНКА СОНЦА Ў РУКАХ

Саломка, лаза, ткацтва і іншыя беларускія промыслы

Букет дзіўных кветак у вытанчанай вазе... Якое дзіва? Зараз жа, летам, каго можна здзівіць кветкамі? Але такімі — можна. Не, сутнасць не ў тым, што букеты і нават вазы зроблены з залацістай саломы. Зноў жа, у нас у Беларусі — традыцыйны матэрыял. Тут важна, як гэты матэрыял выкарыстоўваецца і якія цуды здольны ён утвараць. Усё ж такі разумныя былі нашы продкі: нічога не прападала ў іх гаспадарках, з драбязы і падручных сродкаў умелі зрабіць цуд. І пакінулі ў спадчыну гэтае ўменне сваім нашчадкам. Праўда, мала ўжо тых, хто сам гатовы доўгімі зімовымі вечарамі сядзець з матэрыяламі, падараванымі прыродай, і, вырабляючы з іх нешта адмысловае, напаўняцца цяплом лета, укладваючы гэтае цяпло ў вырабы.

Сёння гэтая справа ў нас стала не проста часткай мастацтва, але і асобнай вытворчай галіной. Хоць адно другога не выключае. Гэта якраз і дэманструе выстава дзяржаўнага вытворча-гандлёвага аб'яднання «Белмастпромыслы», якая працуе ў Музеі гісторыі горада Мінска. Сваю прадукцыю прадстаўляюць розныя фабрыкі мастацкіх вырабаў з усёй Беларусі, якія ўваходзяць у аб'яднанне. У кожнага з прадпрыемстваў свая задача: ёсць «адказныя» за ткацтва, вышыўку, вязанне, пляценне з прыродных матэрыялаў (саломы, лазы, скуры, бяросты), разьбу па дрэве, ганчарства, працы па метале. Хто на што багаты з нашых мастацкіх прыдпрыемстваў — паказвае выстава.

«Сонечныя ўзоры» яе назвалі нездарма: усе вырабы дыхаюць цеплынёй і дораць святло незалежна ад таго, ці гэта радасная саломка, ці вытанчаная лаза, ці прыгожы тканы жаночы строй — узяць, апрануць бы ды пайсці так «у людзі», на якое-небудзь свецкае мерапрыемства. Вось быў бы фурор!

Кажуць, што беларускі народны строй дагэтуль адзін з самых запатрабаваных з усіх вырабаў, на якія здольныя майстры «Белмастпромыслаў». Хто купляе яго для выступленняў на сцэне, а хто — і як сувенір, для падарунка. Нехта — дзеля цёплых і шчырых эмоцый, каб проста быў у хаце і нагадваў, да якога народу належым. Немагчыма згубіць такое ўменне.

А ткацтва? Сёння на прадпрыемствах аб'яднання развіваюцца яго традыцыйныя віды: пераборнае, рамізнае, бранае, ажурнае, падвойнае, кругавое, закладное, на дошчачках. Усё гэта даходзіць да нас з глыбінь стагоддзяў, усё аднаўляецца майстрамі, засвойваецца новымі пакаленнямі мастакоў, якія хочуць рабіць «як калісьці». Напрыклад, у рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве беларускіх народных рамёстваў «Скарбніца» нават арганізоўваюць навуковыя экспедыцыі па абласцях Беларусі, паводле расказаў тых, хто яшчэ памятае і ўмее, вывучаюць старажытныя тэхналогіі з разуменнем рэгіянальных асаблівасцяў. Нездарма ж вырабы, створаныя на «Скарбніцы», былі высока адзначаны на выставах у Расіі, Латвіі, Малдове, Парыжы, Гановеры. А ў сонечным Мадрыдзе нашы новыя скарбы ад «Скарбніцы» былі адзначаны залатым медалём якасці. А вы яшчэ не зразумелі чаму?

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Кніжная паліца

У КОЖНАГА СВАЯ «МАЛАДОСЦЬ»

Пра што не сказалі самі літаратары, тое вядома з успамінаў пра іх

У маладосці кожны вызначаецца, якім шляхам пайсці ў жыцці далей, вывучае рэчаіснасць, асэнсоўвае сутнасць яе з'яў, шукае сэнс для сябе. Сэнс можна сфармуляваць самому, а можна і скарыстацца меркаваннямі іншых людзей, якія ўжо нешта зразумелі і нават падзяліліся сваімі думкамі — праз літаратурныя творы, напрыклад. Варта было ў свой час пагартаць часопіс «Маладосць» — вось дзе была пляцоўка для сустрэч з беларускімі аўтарамі, якія па-свойму бачылі свет, шукалі і адкрывалі ў ім тое, на што цікавы быў менавіта малады погляд, гэта значыць той, якога не было дагэтуль. Вось пра іх час, пра іх творчую маладосць цяпер можна таксама прачытаць — у кнізе «Скрозь «Маладосць».

— Пра што можна прачытаць у кніжцы? Пра тое, «што Янка Сіпакоў хаваў у сейфе?» А што пісаў у лісце да Валянціны Кадзетавай Генрых Далідовіч? Як «даймаў» Сцяпан Даймак? Куды знікла з рэдакцыі «Маладосці» крэсла Машэрава? Каго можна назваць секс-сімвалам «Маладосці»? Як Уладзімір Караткевіч змагаўся за кожнае слова? Вельмі часта ўзгадваюцца нестандартныя сітуацыі з жыцця Уладзіміра Караткевіча, — тлумачыць аўтар кнігі і рэдактар часопіса «Маладосць» **Святлана ДЗЯНІСАВА**. — Усе матэрыялы для гэтай кнігі пісаліся спецыяльна. Сюды не ўвайшло ні адно інтэрв'ю, ні адзін артыкул, якія былі напісаны раней з нагоды юбілеяў часопіса. Крыніцамі ілюстрацый сталі сямейныя архівы знакамітых «маладосцеўскіх» фатографаў Аляксандра Дзятлава і Валянціна Ждановіча. Яшчэ адна крыніца — прыватны архіў Генрыха Далідовіча. Нейкія матэрыялы з Нацыянальнага гістарычнага музея. Кніга створана ў папулярнай манеры, таму і называецца «сямейная кніжка».

«Сямейная кніжка» сапраўды можа аб'яднаць сям'ю. Справа ў тым, што яна прысвечана часопісу «Маладосць», які нарадзіўся 60 гадоў таму, але дагэтуль жыве і імкнецца быць маладым: прадстаўляе аўтараў новага пакалення, а таксама новыя творы тых, хто малады не толькі па ўзросце, але і малады духам. Гэта яшчэ і кніжка-ўспамін пра розныя перыяды жыцця і сталення часопіса. У нас гэты жанр не вельмі распаўсюджаны. Але такія кнігі дадаюць фарбаў да партрэтаў вядомых пісьменнікаў, наогул могуць быць удакладненнем да гісторыі літаратуры, як заўважыў пісьменнік **Алесь БАДАК**:

— Мне здаецца, што кніжка «Скрозь «Маладосць» вельмі шмат дадае і да гісторыі самога часопіса. Мне б хацелася, каб яна была ў першую чаргу для маладых — аўтараў, чытачоў. Каб яны ведалі, якой была маладосць у XX стагоддзі, на пачатку XXI. Як правіла, маладыя, калі прыходзяць у літаратуру, часта ўпэўнены, што ўсё пачынаецца з іх. Гэтая кніжка для маладых карысная тым, што дазволіць зірнуць на часопіс па-новаму. І, можа быць, зацікавіцца гэтым часопісам, тады, напэўна, з'явіцца больш павагі да яго, жадання друкавацца. (Таму што сёння не праблема выдаць кніжку, не праблема выйсці са сваімі творамі да іншых, пасля таго, як з'явіўся інтэрнэт.) Але тут — гісторыя. Тут — асобы. Вядома, любыя ўспаміны трохі суб'ектыўныя. Таму што кожны чалавек, кожны пісьменнік, калі піша дакументальныя творы, заўсёды прадстаўляе свой пункт погляду. Мне асабіста не хапіла прадстаўніцтва 1950-1960 гадоў, трохі не хапіла эпохі Быкава, эпохі Караткевіча ў часопісе «Маладосць», якія друкавалі на яго старонках свае першыя творы. Гэта якраз тое, што застанецца ў нашай літаратуры яшчэ на доўгія часы. Мне трохі не хапіла Міколы Аўрамчыка. Мала ўжо людзей, якія ўспомняць 50-я гады мінулага стагоддзя, як пачыналася «Маладосць». Перавага ў кнізе аддадзена канцу XX — пачатку XXI стагоддзя.

Успамінамі пра эпоху Караткевіча і Быкава ў «Маладосці» гатова была падзяліцца паэтка **Раіса БАРАВІКОВА**, якая ў свой час была рэдактарам часопіса. На прэзентацыі кнігі яна адзначыла:

— Часопіс заўжды быў у авангардзе літаратурнага працэсу, лічыўся самым папулярным, дзёрзкім, смелым. Толькі ў «Маладосці» Быкаў друкаваў свае ранніе апавяданні і аповесці. Гэта быў яго любімы часопіс, у які ён усё аддаваў. Тое ж самае — Караткевіч. Практычна ўсё, напісанае Караткевічам, друкавалася ў «Маладосці». З Маладосці пачынала ўсё маё пакаленне: Яўгенія Янішчыц, Валянціна Коўтун, Галіна Каржанеўская, Алесь Разанаў. Калі я прыехала ў Мінск у 1970-я гады, гэта быў час застою. Хоць у літаратуры ніякага застою не было. Наадварот, было шмат яркіх твораў, імёнаў, беларуская літаратура вельмі цанілася ў былым СССР. Усё, што звязана з «Маладосцю», вельмі дарагое і незабыўнае.

Каб успаміны не губляліся, не сыходзілі разам з іх уладальнікамі, патрэбны кнігі мемуараў пра літаратараў і літаратурнае жыццё: гэта дае адчуванне працэсу, які існуе і не прыпыняецца незалежна ад таго, якія часы перажывае краіна. Таму ў Выдавецкім доме «Звязда» з'явілася асобная серыя кніг мемуараў, якая прадстаўляе слынных літаратараў: напрыклад: «Іван Шамякін: вядомы і невядомы». А таксама — Быкаў, Караткевіч і іншыя класікі. У 2013 годзе адноўлена таксама серыя «Бібліятэка «Маладосці» (раней у 1980-я, 1990-я гады выходзілі тоненькія маленькія кніжачкі асобных аўтараў). Ужо рыхтуюцца некалькі кніг у гэтай серыі, прычым розных жанраў: аповесці, гістарычныя дэтэктывы, зборнікі маладой паэзіі.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Сучаснік

Юры СТАНКЕВІЧ:

«РОЛЯ ПІСЬМЕННІКА — СПЫНІЦЬ МАРАЛЬНАЕ ПАДЗЕННЕ ЧАЛАВЕКА»

Чалавека з прынцыпамі, акрэсленай жыццёвай пазіцыяй можна любіць, ці не любіць, калі погляды не супадаюць. Але не паважаць паслядоўных асоб немагчыма хаця б таму, што іх хоць у «Чырвоную кнігу» запісвай — з-за іх рэдкасці. Прызнаюся адразу, што я — сярод гарачых прыхільнікаў Юрыя Станкевіча, аднаго з самых цікавых сучасных беларускіх пісьменнікаў. Пры тым, што сама я талерантная да многіх сучасных грамадскіх праяў, мне імпануе яго бачанне свету, у якім жанчыны не губляюць жаноцкасці і застаюцца каханымі, маці і сяброўкамі, а не толькі «працоўнымі адзінкамі». А мужчыны Станкевіча — не бясплоцыя істоты, а ваяры святла ў самых неспрыяльных умовах.



У сёмым нумары часопіса «Полымя» выйшла аповесць спадара Станкевіча «Брамнік заўжды самотны». Яна адрасавана шырокаму колу чытачоў, але павінна выклікаць цікавасць у самага складанага чытача — у сучасных падлеткаў.

— Так. Мне і раней нашы часопісы замаўлялі невялікія аповеды для юнацтва, што я, па магчымасці, выконваў. — Так патлумачыў свой зварот да тэмы моладзі сам пісьменнік. — Тое ж адбылося і з аповесцю для тынейджараў «Брамнік заўжды самотны». Згодны, што пісаць для падлеткаў няпроста. Але я мяркую, што збольшага задачу выканаў.

Больш за тое, сабраў з раней надрукаванага матэрыял для нечаканай нават для сябе кнігі для малодшага пакалення, якую, магчыма, і выдам сёлета. Урэшце, пабачым, як атрымаецца.

Новае пакаленне, як і ва ўсе папярэднія гады, часам захапляе, здзіўляе, бывае, насцярожвае, бо падзяляецца на асобныя плыні. Яно кемлівае, больш энергічнае, часам прагматычнае. Але бывае, што пры ўсёй кемлівасці вельмі даверлівае да «сволачаў». Я маю на ўвазе неабдуманую, небяспечную даверлівасць да тых, хто падсаджвае моладзь на наркотыкі, хто адводзіць іх у бок ад здаровага грамадскага жыцця, ад нацыянальнай ідэі, а ўводзіць у іх свядомасць еўрасаюзаўскі мультыкультуралісцкі «мутняк». Яшчэ горш — з ім разам памяркоўнасць да гомасексуалізму і ўсялякіх вычварэнцтваў. Вось брыдкі і нечаканы прыклад. Раней на тэлебачанні запусцілі амерыканскі серыял «Часткі цела», дзе «педаліраваліся» гомасексуальныя сувязі, інцэст, разбэшчванне і развал сям'і. Чаму такі бруд дапускаюць на экран? Не здзіўляюся, што паміж гэтай стужкай і смерцю дзяўчат пад нажамі пластычных хірургаў існуе нябачная сувязь. І гей-трамвайчык пад колерамі вясёлкі бегаў нядаўна па Мінску.

Знаходзяцца і ў нас некаторыя людзі, якія лічаць набытыя за вякі маральныя каштоўнасці «перажыткамі ў 2013 годзе». На іх погляд прыйшоў час сцёбаў, дураплясаў, флэш-мобаў, а то і гомасексуальных шлюбаў, што ўвогуле дзіка і злачынна. Таму, лічу, выхоўваць у моладзі гераічны пачатак — асноўная задача таго пісьменніка, які раптам уздумаў напісаць нешта і для дзяцей.

— Калісьці на пытанне аб сюжэтах пачула ад вас, што яны — пад нагамі, толькі спяшайся запісваць. Гэта і цяпер так? Што для вас у літаратурнай працы найперш — натхненне ці самадысцыпліна? Калі натхненне, то што ці хто яго выклікае?

— І натхненне, і самадысцыпліна. Галоўнае, не памыляцца ў самаацэнцы. Калі няма што сказаць, то лепш не назаляць чытачу і сабе. А ўвогуле мне даспадобы выказванне на гэты кшталт былога кандыдата на «нобеля» японскага аўтара Юкіа Місімы: «Стварыць цудоўны твор — гэта значыць самому стаць цудоўным, бо паміж мастаком і яго творам не існуе маральнага бар'ера».

Жыццё шматаблічнае, але сюжэты трэба выбіраць абдумана, не збівацца на бытавуху. Чаго варты пісьменнік, які не здольны вырабіць моцны сюжэтны стрыжань? Характэрны прыклад. Джона Апдайка неаднаразова вылучалі на Нобелеўскую прэмію, а ён яе так і не атрымаў па прычыне ракавой заганы — дысбалансу паміж кваціста-тай раскошай стылю і бесхрыбетным і малакроўным сюжэтам. А вось думка расійскага крытыка Сяргея Белякова пра вядомага зараз празаіка Рамана Сенчына: «Паспяховы пісьменнік, быццам усё добра, незразумела толькі адно: каму і навошта патрэбны кнігі аўтара, які не здольны прыдумаць арыгінальнага сюжэта...»

І сапраўды. Замест сюжэтнай, у нашых суседзяў часам з'яўляецца скандальная, або так званая «фекальная» літаратура: Ерафееў, Сарокін і іншыя. Нават італьянскі «літканібал» Альда Новэ на іх фоне выглядае большменш прыстойным аўтарам. Узніклі неяк і ў нас такія «раманчыкі». Як жа ж не змалпаваць з расійскага трэшу? Дый толькі век іх аказаўся кароткі.

Ёсць і ў нашай літаратуры нешта падобнае. У сэнсе няздольнасці пабудаваць элементарны сюжэт. Ды й таленту бракуе.

— Усё так... Калі б можна было выканаць сваё жаданне, то я пажадаў бы вярнуць і котку (і не адну), і сабак, якія да гэтага жылі побач са мной. Бо сярод жывёлін трапляюцца вялікія разумнікі. Чалавек часта не адчувае падсвядомай сувязі з жывёлай, якая жыве побач. А дарэмна і сумна. Дый на здраду яны, у адрозненне ад людзей, не здольныя. Як выказаўся аднойчы Славамір Мрожэк, зараз я люблю ўсё жывое, акрамя чалавека.

— У гэтым выказванні генія сканцэнтраваны, мушу думаць, усе расчараванні ў самай дасканалай «жывёліне» — чалавеку. Але ж Юсі Адлер-Ольсен, адзін з папулярных дацкіх пісьменнікаў-дэтэктыўшчыкаў, у сваім інтэрв'ю для расійскага часопіса «Огонёк» выказаўся, што пісьменнік абавязкова піша для чытача. Маўляў, калі робіць гэта для сябе, то няхай піша «ў стол». Вы згодны з такім меркаваннем?

Кожны беларускі пісьменнік павінен напісаць хоць бы адзін дэтэктыў, што б паслужыла на карысць умацавання нашай роднай мовы.

Так, перад «распілам» якой «лідарпрэміі» прылятае з-за мяжы «птушка заўтрашняга дня» з бародкай а-ля Хо Шы Мін, бегае па літтусоўках, нешта верашчыць, за што часам атрымлівае па пысе ў пераносным і прамым сэнсе. І – зноў у Гамбург, «чакаць зменаў».

— У адным з інтэрв'ю пачула, што каб была магчымасць выканання аднаго жадання, вы б папрасілі ажывіць сваю котку. А зараз? І ўвогуле, што такое котка для чалавека — сябар, залежная, ці дасюль непрыручаная, істота, магчымасць назіраць за часткай прыроды ў перыметры свайго жытла?.. Ці нешта яшчэ?.

— Некаторым творцам было дадзена так значна апярэдзіць свой час, што пры жыцці іх не толькі не разумелі, а, бывала, прымалі як ворагаў ці вар'ятаў. Да Вінчы, Шэкспір, Ван Гог, Ніцшэ, Стэндаль. Многія з іх працавалі «ў стол». «Мяне будуць чытаць праз 200 гадоў», — запісаў у сваіх дзённіках Стэндаль, «апошні вялікі псіхолаг», паводле слоў Ніцшэ. Што і спрадзілася. «На сутнасці, калі я чаго-небудзь дабіваўся, дык толькі ў веданні людзей», — прызнаваўся геніяльны дзівак, які шчасліва пазбег гібелі ў час расійска-французскай вайны 1812 года. У сваім аўтабіяграфічным рамане «Анры Брулар» (і не толькі) ён выказаў свой прысуд і сабе, і свайму пакаленню, з якім так і не здолеў паразумецца. Так што вырашаць, для каго пісаць, пэўна, праблема самога творцы.

— Разумею вашу гаркоту: да чытача прыходзіцца «прадзірацца» скрозь чыесьці сумнеўныя густы і г.д, праз абсурдныя абвінавачванні ў чалавекафобіі. Хаця зразумела, што толькі вера ў чалавека, у здаровы сэнс вымушае пісьменніка апеляваць да яго.

— Пасля таго, як пайшлі з жыцця Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў, Анатоль Грачанікаў, Янка Брыль, Кастусь Тарасаў, многія іншыя сумленныя прадстаўнікі нашай літаратуры — пахіснуліся нейкія маральныя бар'еры. Актывізаваліся графаманы, левыя лібералы і прыхільнікі еўрасаюзаўскіх каштоўнасцяў, кшталту мультыкультуралізму.

Ёсць яшчэ і хітрыя артадоксы, пад «прэс» якіх часам трапляю і я. Прыкладаў шмат. Але ўсе іх пералічваць — занадта. Толькі самае «гарачае».

Так, параўнальна нядаўна знялі з паказу п'есу «Шэры-брэндзі, ангел мой» у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, якая была скіравана супраць наркаманіі і СНІДу. П'еса набыла вельмі прыхільныя рэцэнзіі. Але за два гады (!) мне нават не пазванілі і не растлумачылі, чаму яе знялі.

Ці яшчэ: адна прыхільніца левых ліберальных каштоўнасцяў, аналізуючы кнігу «Шал», напісала, што «негры ў Станкевіча — крыніца большасці бед беларускага народа». Дарэмная спроба ўкусіць. Лічу, што «крыніца «бед» — такія літаратары, як яна.

Расчараванне ў большасці людзей, альбо ва ўсіх, як у вышэйназванага Славаміра Мрожэка, — вельмі моцнае негатыўнае пачуццё, тым больш калі бачыш, як у іх, нібы ў падвопытных пацукоў, увесь час толькі і выяўляецца неадольная прага да «кнопкі задавальненняў».

— Юры, у беларускай найноўшай сучаснай літаратурнай прасторы вы амаль ці не першы пачалі пісаць свае творы ў форме трылераў. Фармальна трылер — прыгодніцкі жанр, трымае чытача ў напрузе. Але ў вас гэта яшчэ і складаныя абставіны, у якіх чалавек альбо годны, альбо слабак. Літаратурны герой Станкевіча — адзіночка, чалавек самотны. Але ў нейкім сэнсе ён усё роўна — пераможца. Вы аптымістычна пазіраеце на сучаснікаў?

— Я з найвялікшай павагай адношуся да творчасці нашага нацыянальнага генія Уладзіміра Караткевіча. Менавіта ён калісьці выказаўся, што кожны беларускі пісьменнік павінен напісаць хоць бы адзін дэтэктыў, што б паслужыла на карысць умацавання нашай роднай мовы. Я таксама, як і многія іншыя, памкнуўся выканаць яго запавет. Таму, можа, і з'явіліся на свет фантастычны раман «Пятая цэнтурыя, трыццаць другі катрэн», аповесці «Рыфма», «Пераход» і г.д.

Задача альбо роля пісьменніка — спыніць маральнае падзенне чалавека, якое паскараецца ва ўсім свеце. Тым-сім трэба было б успомніць не толькі пра нацыянальную ідэю, але і пра агульначалавечыя наспелыя патрэбы: яўгеніку, тэлегонію, і пра тое, што так і нераскрыта абяцаная «Тэорыя Усяго».

Чалавечы розум сёння заняты ўдасканаленнем усялякіх айпадаў, айфонаў, смартфонаў і г.д. Чым усё гэта скончыцца — можна прадбачыць. У сваёй антыўтопіі «П'яўка» я закрануў і гэтае балючае пытанне. Дарэчы, раман выйшаў двума выданнямі, і, па чутках, рыхтуецца трэцяе.

— Дзякуй за інтэрв'ю і навіну пра трэцяе выданне, бо прыйшлося кніжку замаўляць у сеціве — у крамах яе я ўжо не знайшла.

Ларыса РАКОЎСКАЯ

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

на право заключения договора аренды земельных участков в г. Орше и г. Барани; по продаже земельных участков в частную собственность в д. Андреевщина Оршанского района

Лот №	Месторасположение и площадь земельного участка	Начальная цена продажи (руб.)	Условия заключения договора аренды	Инженерное обеспечение земельного участка	Сумма задатка (руб.)
1	7-й пер. Липковский, д. 3 площадью 0,1050 га. Кадастровый номер 223650100001013139	15 762 777	Срок договора – 50 лет. Целевое использование – для строительства и обслуживания жилого дома.	Централизованное газоснабжение – да, центральное водоснабжение – да, централизованное теплоснабжение – нет, электроснабжение – да, участки находятся в санитарно-защитных зонах – нет, наличие асфальтированного подъезда – нет, наличие железнодорожного подъезда – нет, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – нет.	1 576 300
2	ул. М.Богдановича, д. 8 площадью 0,1066 га. Кадастровый номер 242400000001011021	16 133 695	Срок договора – 50 лет. Целевое использование – для строительства и обслуживания жилого дома.	Централизованное газоснабжение – да, центральное водоснабжение – да, централизованное теплоснабжение – нет, электроснабжение – нет, участки находятся в санитарно-защитных зонах – нет, наличие асфальтированного подъезда – нет, наличие железнодорожного подъезда – нет, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – да.	1 613 400
3	ул. 60 лет БССР, площадью 0,0300 га. Кадастровый номер 223650100004002868	15 804 460	Срок договора – 25 лет. Целевое использование – для строительства административно-торгового здания.	Централизованное газоснабжение – да, центральное водоснабжение – да, централизованное теплоснабжение – да, электроснабжение – да, участки находятся в санитарно-защитных зонах – нет, наличие асфальтированного подъезда – да, наличие железнодорожного подъезда – нет, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – да.	1 580 500
4	4-й пер. Чернышевского, площадью 0,0030 га. Кадастровый номер 223650100001013256	1 092 398	Срок договора – 5 лет. Целевое использование – для установки торгового павильона по продаже страховых полисов.	Централизованное газоснабжение – да, центральное водоснабжение – да, централизованное теплоснабжение – нет, электроснабжение – да, участки находятся в санитарно-защитных зонах – да, наличие асфальтированного подъезда – да, наличие железнодорожного подъезда – нет, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – да.	109 300
5	ул. Комсомольская, площадью 0,0178 га. Кадастровый номер 223650100001013271	9 702 167	Срок договора – 10 лет. Целевое использование – для установки остановочного пункта с торговыми павильонами.	Централизованное газоснабжение – нет, центральное водоснабжение – да, централизованное теплоснабжение – нет, электроснабжение – да, участки находятся в санитарно-защитных зонах – нет, наличие асфальтированного подъезда – да, наличие железнодорожного подъезда – нет, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – да.	970 300
6	ул. Ленина, площадью 0,0396 га. Кадастровый номер 223650100001013277	66 235 084	Срок договора – 50 лет. Целевое использование – для строительства кафе на 50 посадочных мест.	Централизованное газоснабжение – да, центральное водоснабжение – да, централизованное теплоснабжение – да, электроснабжение – да, участки находятся в санитарно-защитных зонах – нет, наличие асфальтированного подъезда – да, наличие железнодорожного подъезда – нет, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – да.	6 623 600
7	ул. Семенова, площадью 0,0024 га. Кадастровый номер 223650100004002869	488 065	Срок договора – 5 лет. Целевое использование – для установки торгового павильона по продаже товаров для домашних животных.	Централизованное газоснабжение – да, центральное водоснабжение – да, централизованное теплоснабжение – да, электроснабжение – да, участки находятся в санитарно-защитных зонах – нет, наличие асфальтированного подъезда – да, наличие железнодорожного подъезда – нет, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – да.	48 900
8	ул. Оршанская, г. Барань, площадью 0,0036 га. Кадастровый номер 242450200002000116	905 132	Срок договора – 5 лет. Целевое использование – для обслуживания торгового павильона.	Централизованное газоснабжение – нет, центральное водоснабжение – да, централизованное теплоснабжение – да, электроснабжение – да, участки находятся в санитарно-защитных зонах – нет, наличие асфальтированного подъезда – да, наличие железнодорожного подъезда – нет, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – да.	90 600
9	ул. Зеленая, д. Андреевщина, площадью 0,1325 га. Кадастровый номер 223683900101000377	11 495 827	Целевое использование – для строительства и обслуживания жилого дома.	Централизованное газоснабжение – да, централизованное водоснабжение – да, централизованное водоотведение – нет, централизованное теплоснабжение – нет, участки находятся в радиусе 500 метров от центра населенного пункта – нет, участки находятся в санитарно-защитных зонах – нет, участки примыкают к асфальтированным дорогам и улицам – нет, участки находятся на хуторе и в труднодоступной местности – нет.	1 149 600

1. **Аукцион состоится в 11.00 02 сентября 2013 г. в г. Орше в здании ГП «Оршанский региональный центр поддержки предпринимательства» по ул. Ленина, 230 г. Орши.**

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагается документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет государственного предприятия «Оршанский региональный центр поддержки предпринимательства» № 3012500014634 в ЦБУ № 202 ОАО «Белгазпромбанк», МФО 153001742, УНП 391134716, с отметкой банка, а также представляются: физическим лицам – документ (копия), удостоверяющий личность (паспорт), или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально, в случае если участник является представителем физического лица; юридическим лицам – копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, либо нотариально удостоверенная доверенность, если участник является представителем юридического лица.

3. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

Лот №1, № 2, № 3, № 4, № 5, № 6, № 7, № 8:

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;
- не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколах о результатах аукционов, заключить с Оршанским районным исполнительным комитетом (для **лота №8** с Бараньским городским исполнительным комитетом) договор аренды земельного участка;
- в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев с даты вступления в силу решения Оршанского районного исполнительного комитета, обратиться в Оршанский филиал РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за осуществлением государственной регистрации прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;
- получить в установленном порядке разрешение на проектно-изыскательские работы и разработать проект на строительство объекта;
- юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю в течение шести месяцев, а гражданину в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство);
- осуществить строительство объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Лот № 9:

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;
- в течении двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией прав на земельный участок;
- получить в установленном порядке разрешение на проектно-изыскательские работы и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий один год;
- в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;
- осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

